Адзначым трынаццатую гадавіну вызваленьня Беларусі ад белаакупантаў новымі перамогамі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва!

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 11 1933 г. АУТОРАК № 151 (4695) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

За трынаццаць год

11-е ліпеня — гістарычная дата ў жыцьці рабочай клясы і ўсіх працоўных БССР, у іх барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялізму. У гэты дзень трынаццаць год таму назад гераічная Чырвоная армія, падтрыманая масавым партызанскім рухам, народжаным бязьмернай нянавісьцю народных мас да імпэрыялістычных захватчыкаў, ґвалтаўнікоў і прыгнятальнікаў, вызваліла Менск, а з ім і ўсю нашу рэспубліку ад аку пацыйных войск польскай буржуазіі.

Гэта быў апошні пераможны бой з полчышчамі інтэрвэнтаў і імпэрыялістычных драпежнікаў, за перамогу дыктатуры пралетарыяту ў нашай краіне. З гэтага моманту пачынаецца мірнае будаўніцтва Беларускай ССР.

Цяжкая спадчына дасталася нам. Знаходзячыся на стыку з капіталістычнай Эўропай, Беларусь першай прымала на сябе ўдары інтэрвэнтаў і імпэрыялістычных грабежнікаў, розных контрэвалюцыйных полчышчаў. За руінаваньнікамі — легіёнамі Доўбар-Мусьніцкага прышлі войскі германскіх імпэрыялістаў. Не пасьпеўшы перадыхнуць пасьля выратаваньня ад нямецкай акупацыі, Беларусь зноў аказалася захвачанай польскімі войскамі. Апіраючыся на шырокае падтрыманьне імпэрыялістычных інтэрвэнтаў, тут плямла «шляхецкавалі» бела гвардзейскія банды Савінкава і Булак-Балаховіча.

Верныя служкі інтэрвэнтаў і акупантаў — беларускія нацыянал-дэмакраты, здраднікі беларускага народу — Ластоўскі, Луцкевічы і іншыя, шлёскі на чарзе лізалі боты то нямецкіх, то польскіх захватчыкаў, гатовыя ў нацыянальным самазабыцьці прадаць краіну каму хочаце і як хочаце, толькі-б яна пя была савецкай, бальшавіцкай, толькі-б захаваць ў ёй уладу капіталіста, памешчыка і кулака. За імі пейтакам, пейтакам, баючыся як-бы не адстаць у здрадніцкай старанасьці, бегілі прадстаўнікі іншых нацыяналістычных партый, у тым ліку і «сацыялістычных» — Буйніцу, усякіх рознакаліберных сацыялістаў і інш. Яны, як і беларускія нацдамы, служачы адному гаспадару, бачылі ў імпэрыялістычных інтэрвэнтах і акупантах выратавальнікаў ад «бальшавіцкай тыраніі», якія нясуць на сваіх штыхох «дэмакратычныя свабоды». Дарма, што «выратавальнікі» несьлі з сабой самыя пагрозныя часы царскіх пагромаў.

Якім-жа павінен быў быць рэвалюцыйны энтузіязм мас і воля да барацьбы, якою павінна была быць сіла нашай партыі, — правадыра, арганізатара гэтых мас, каб у гэтай барацьбе перамагчы.

За слаўнымі, незабыўнымі старонкамі адкрытай узброенай барацьбы з усіх савым ворагам унутры і па-за краінай пачынаецца ня менш блескучая паласа вялікіх перамог мірнай працы. Нам дасталася разбураная гарады і вёскі, эканамічна знясіленая, аслабленая краіна, краіна, залітая крывёю, пакінутая пазьлічонымі аквары ў барацьбе за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне, за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Якім-жа рэвалюцыйным энтузіязмам і пафасам будаўніцтва павінны былі быць ахоплены перамочныя масы, каб у нічтожных тэмпах аднавіць зруйнаванае і разгарнуць новае будаўніцтва, каб забясьпечыць поўную перамогу новага сацыялістычнага ладу

13 год, што прашлі з дня выгнаньня з тэрыторыі Беларусі апошніх аку пацыйных войск, прадстаўляюць грандыёзную карціну нічуванага будаўніцтва, гіганцкага размаху як эканамічнага, так і нацыянальна-культурна та развіцьця нашай рэспублікі.

Што сабой прадстаўляла Беларусь у эканамічных і культурных адносінах пры царызме і 13 год таму назад і што яна прадстаўляе сабой цяпер, у якасьці роўнапраўнага члена ў брацкай сям'і народаў СССР? Беларуская ССР усім ходам свайго разьвіцьця на працягу мінуўшых трынаццаці год, сваімі перамогамі ў гаспадарчым і нацыянальна-культурным будаўніцтве сьведчыць аб правільнасьці і велічы генэральнай лініі партыі і яе ленінскай нацыянальнай палітыкі. Дзякуючы ленінскай нацыянальнай палітыцы нашай партыі, ас ноўным прынцыпам якой зьяўляецца нацыяваньне раней прыгнечаных народаў, адстаўшых у сваім эканамічным і культурным разьвіцьці, да ўзроўню больш перадавых народаў Савецкага саюзу, БССР быў забясьпечаны адносна больш высокія тэмпы росту і разьвіцьця.

Пралетарыят Савецкага саюзу, аказаўшы шырокую дапамогу пралетарыяту і працоўным масам Беларусі ва ўзброенай барацьбе, аказаў ім ня меншую дапамогу і ў мірным будаўніцтве. Дзякуючы гэтай дапамозе беларуская прамысловасьць прайшла свой адбудоўчы перыяд раней, чым прамысловасьць Савецкага саюзу ў цэлым. І ў рэканструкцыйны перыяд, у перыяд першай пяцігодкі прамысловасьць, сельская гаспадарка і культурнае будаўніцтва ў БССР разьвіваліся тэмпамі больш высокімі, чым па СССР у цэлым.

У рэзультаце БССР, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, якая няўхільна змагалася за сваю генэральную лінію і ленінскую нацыянальную палітыку, вяла з посьпехам барацьбу за ліквідацыю сваёй фактычнай эканамічнай і культурнай адсталасьці.

Разам з усім Савецкім саюзам БССР стала індустрыяльна-аграрнай краінай, перадавой савецкай рэспублікай, рэспублікай сацыяльнай пісьменнасьці, з высокім разьвіцьцём у нацыянальных формах сацыялістычнай культуры, навукі і мастацтва.

На тэрыторыі нашай рэспублікі вырасьлі новыя буйныя прамысловыя цэнтры, у якіх раз сярод даваеннага часу вырасьлі кадры пралетарыяту.

На аснове індустрыяльных перамог СССР пераўтворана тэхнічная база раней надзвычай адсталай сельскай гаспадаркі нашай рэспублікі. Пераўтворана сацыяльна-эканамічны твар нашай вёскі.

Якраз са сьвятам вызваленьня БССР ад акупантаў сустрэне другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў. Гэты зьезд зьяўляецца яркай дэманстрацыяй вялізарнейшых нашых перамог у сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі. Ні ў кога ўжо ня можа быць сумненьня ў тым, што калгасны лад перамог канчаткова і беспаваротна, што звароту да мінулага, да кулацкай кабалы, да жабрацкай адпаасобнай гаспадаркі асноўных мас вёскі няма і быць ня можа.

Мінулая вясна і ўвесь бягучы год увойдуць у гісторыю нашай барацьбы за перамогу сацыялізму ў вёсцы, як год рашаючых зрухаў у сьвядомасьці асноўных мас сялянства, як год вялікага пафасу калгаснай працы. І гэты год павінен стаць апошнім годам труд насьцяй. Ён павінен адыграць рашаючую ролю ў ажыцьцяўленьні лёзунгу тав. Сталіна аб ператварэньні калгасьнікаў, учарайшых беднякоў і сераднякоў, у заможных.

Цяпер для ўсіх нас віцавочна, што гэта залежыць ад нас самых, што справа тэта цалкам у нашых руках, залежыць ад нашай волі, ад нашых намаганьняў. Гэта ня можа не парадзіць новага энтузіязму ў сэрцах шмат мільённых будаўнікоў сацыялістычна га грамадзтва.

«Генэральны бой» за сацыялістычны ўраджай, пераможна пачаты вясной, мы абавязаны напружаньнем усіх сіл давесьці да канца. Зьберагчы добры ўраджай, свачасова і без усякіх страт убраць яго, забясьпечыць першачарговае выкананьне абавязацельстваў перад савецкай дзяржавай — гэта асноўны лёзунг у сьвята вызваленьня БССР ад акупантаў. Пад гэтым лёзунгам павінен прайсьці і зьезд перадавых байцоў новай калгаснай вёскі.

Разам з ростам упэўненасьці магутнасьці расла і міжнародная роля СССР, неадлучнай часткай якога зьяўляецца Беларуская ССР. Якраз апошнія дні адзначыліся новымі буйнейшымі перамогамі мірнай палітыкі СССР. Мы далі прыкладны ўрок ангельскім цывёрдалобым, а з імі і ўсяму капіталістычнаму сьвету, што СССР нельга паставіць на калені. Заключэньне пактаў аб вызначэньні нападаючага боку з цэлым радам капіталістычных дзяржаў, у тым ліку з нашымі суседзямі на Захадзе, мы затрымалі манэўраваньне буйных імпэрыялістычных дзяржаў і высока ўзнялі ролю краіны Саветаў, як буйнейшага фактару міжнароднага міру.

Такую настойлівую пасьлядоўную палітыку міру можа весьці толькі на ша краіна, краіна, якая будуе сацыялізм, якая ў сваёй міжнароднай палітыцы кіруецца асноўным прынцыпам, бліскуча сфармуляваным тав. Сталіным: «Ні адной пядзі чужой зямлі ня хочам, але і сваёй зямлі, ні адна го вяршка сваёй зямлі не аддамо нікому».

Нашы перамогі дасягнуты не ў парадку самацёку, а ў бязупынным барацьбе з клясавым ворагам, у бязупынным баёх за генэральную лінію нашай партыі і ленінскую нацыянальную палітыку. Партыя непрымірымма змагалася супроць палякарасійскага шавінізму, які прадстаўляе галоўную небясьпеку для ўмацаваньня пралетарскага інтэрнацыяналізму, і супроць нацдэмаправага, які зьяўляецца з перыпых дзён пралетарскай рэвалюцыі агентурай інтэрвэнтаў, а таксама супроць шавінізму іншых колераў.

Мы разгромілі прыгнэтаўшчыну і забясьпечылі пераход сельскай гаспадаркі на сацыялістычныя рэйкі. Мы нанесьлі рашучы ўдар па новых шкодніцкіх спробах адрадзіць прыгнэтаўшчыну і сарваць справу калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Партыя не дазволіла разгромленым рашткам пад домаўшчыны ў новых формах, пад прыкрыцьцём фальшыва-нацыянальнага сьцягу, разгарнуць барацьбу супроць сацыялістычнага наступленьня. Дагэтуль памылкі ў практычным правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі, на якія нам указаў ЦК УсеКП(б), паслужылі для КП(б)Б сур'ёзным урокам.

Барацьба адбываецца. Разгромлены кулак яшчэ недабіт. Таму ні малейшага аслабленьня магутнасьці пралетарскай дыктатуры і рэвалюцыйнай пільнасьці. Наадварот, перад вялічэзнымі задачамі другой пяцігодкі, яшчэ больш умацуем сілы пралетарскай дыктатуры і яшчэ вышэй узьнімем рэвалюцыйную пільнасьць. Гэта неабходная ўмова для завяршэньня перамогі.

Да новых баёў і новых перамог!

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЗЬЕЗДУ

Учора адкрыўся Ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў

КІРУЮЧЫЯ ОРГАНЫ ЗЬЕЗДУ

Ганаровы прэзыдыум

Зьездам аднагалосна выбран у ганаровы прэзыдыум увесь склад Палітбюро ЦК УсеКП(б) і т. т. ПОСТЫШАЎ, РУДЗУТАК, ЯКАЎЛЕЎ, ГІКАЛО, ТЭЛЬМАН, ЛЕНСКІ, КОРЧЫК, КОСАРАЎ, РУМЯНЦАЎ, ШАРАНГОВІЧ, ГАЛАДЗЕД, ЧАРВЯКОЎ І ЛЫЧОЎ.

Прэзыдыум зьезду

У прэзыдыум зьезду выбраны: т. т. ГІКАЛО, ШАРАНГОВІЧ, ЖАБРОЎСКІ, РЫСКІН, ІВАНОЎ, АНЦІПАЎ, САХАРАВА, ЧАРВЯКОЎ, ГАЛАДЗЕД, БЭНЭК, УБАРЭВІЧ, АРАНШТАМ, ЗАКОЎСКІ, КАРТУКОЎ, КАВАЛЬЧУК, ГЕРЦОВІЧ, БРАГІНСКІ, ЛЫЧОЎ, ЦІМАШЭНКА, КУДЗЕЛЬКА, ПЫЖЫКАЎ, РАТНЭР, АНДРЭЙЧЫКАВА, НІЗАЎЦОЎ, БАЦЬВІНІК (ад фабрыкі «Кастрычнік», работніца-ўдарніца, член КП(б)Б з 1930 г.), ГУРЭВІЧ (рабочы заводу імя Варашылава, беспартыйны, стары рабочы-ўдарнік), КОХАН (работніца заводу «Камунар», ударніца, токар па мэтапі, член партыі), ШЭЙДЛІНА (член бюро абкому Заходняй вобласьці і рэдактар газэты «Рабочий путь»), БАЧЭНКОВА (калгасьніца-ўдарніца Заходняй вобласьці, узнагароджаная ордэнам Чырвонага сьцягу), ЖАЎРЫК ПЁТРА (старшыня калгасу Слуцкага раёну), ПЕРКАЛЬ БАСЯ (ударніца калгасу «Першы май», выпрацавала 120 працадзён, член КСМ), ДУБЕНЬ Е. (ударніца калгасу «Ударнік», Барысаўскага раёну, 65 год, арганізатар калгасу ў 1930 годзе і ўдзельнік буксірнай брыгады, мае 85 працадзён), КРУГЛІК АЛЯКСАНДАР (ударнік калгасу «Чырвоная зорка», Барысаўскага раёну, у калгасе з 1922 году, член КП(б)Б, брыгадзір, дэлегат першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, некалькі раз прэміраваны, мае 218 працадзён), ЗАВАЦКІ (ударнік калгасу «Ленінскае жыцьцё», працуе старшынём калгасу, член КП(б)Б, у калгасе з 1920 г.), МАРТЫНАВА (старшая даярка калгасу імя Сталіна, Рагачоўскага раёну, беспартыйная, мае 140 працадзён), ГАРБАЧ МІХАСЬ (старшыня калгасу «Прамень» Чырвона-Слабодзкага раёну), ПЯРТОЛЬ ТАЦЬЦЯНА (ударніца калгасу «КІМ» Чырвона-Слабодзкага раёну), ХМЯЛЕЦКАЯ МАРЫЛЯ (ударніца калгасу «Першага мая», Кайкаўскага сельсавету, Менскага раёну, тры разы прэміравана за ўдарную работу, мае 110 працадзён), СТЭШЫЎ (ударнік калгасу «Чырвоны пагранічнік», Старобінскага раёну, які скончыў першым сяўбу), БАЛАМУТАЎ (ударнік калгасу імя Леніна, Гомельскага раёну, мае 250 працадзён), КАЛЕЧЫЦ З. (старшы конюх калгасу імя Пакроўскага, Даяржынскага раёну, тры разы прэміраваны, член праўленьня калгасу, мае 170 працадзён), ЧАРНЯКОЎ СЯМЁН (ударнік калгасу «Камунар», Чавускага раёну, беспартыйны, мае 259 працадзён), ІВАШКЕВІЧ ГЕЛЯ (ударніца калгасу «Камуна», Бялыніцкага раёну, чатыры разы прэміравана, мае 120 працадзён), МАЕЎСКІ (брыгадзір паляводчай брыгады калгасу «КІМ», Капыльскага раёну, член ЛКСМБ, у 1933 г. выпрацаваў 250 працадзён), МАЛЕЦ ПЁТРА (старшыня калгасу «Сьветлае жыцьцё», Лепельскага раёну, член КП(б)Б, тры разы прэміраваны), ВЫСОЦКІ МІХАСЬ (ударнік калгасу «Чырвоная горка», Лепельскага раёну, мае 202 працадні), ЦЕЦЯРАЎ СЬЦЯПАН (старшыня калгасу Касьцюковіцкага раёну, мае 295 працадзён), ЛІТВІНАЎ (старшыня калгасу «Ударнік», Шклоўскага раёну, кандыдат КП(б)Б, калгас атрымаў пераходны сьцяг ад райкому і РВК), ЯРАВЕЦ ЛЮБА (памочнік брыгадзіра паляводчай брыгады з калгасу Смалявіцкага раёну), КАКОРА АНТАНІНА (член КП(б)Б, сакратар ячэйкі, брыгадзір, арганізатар калгасаў у Клімавіцкім раёне), МАРЧЫК ГАННА (ударніца калгасу «Пралетары», Бабруйскага раёну), КАЧАН ПРОСЯ (ударніца калгасу «Новыя Даманавічы», Мазырскага раёну), РАБІНОВІЧ (батрачка, яўрэйка, з калгасу «Чырвоны берег», Аршанскага раёну, член КСМ), ХАРАНЕКА (ударнік калгасу «Чырвоная зорка», Парыцкага р.

У сакратарыят зьезду выбраны т. т. ПАССЭ, ВІЛЬЧАК, ЛЯХАЎ (ЦК ЛКСМБ), СТРЭЛЕ, БАШМАЧНІКАЎ, ЛАБАДАЕЎ і кіраўнікі Слуцкай і Чырвона-Слабодзкай дэлегацый — т. т. КАРОТКІН і ПРЫХОДЗЬКА.

У рэдкалегію зьезду выбраны т. т. МІНКІН, ФІШБЭЙН, ШАСТАКОЎ, ВІГДАРОВІЧ, ШПІЦЭР, ГОЛЬДШВАРЦ, УСТАЛЫ.

У мандатную камісію выбраны т. т. ГНІЛЯКЕВІЧ, КАМАРОЎ, ШУМЕЙКА, СКРОБАВА, ЗАЛЕСКІ, МАРОЗАЎ і ДЗЯМІДОВІЧ.

Прывітаньне ЦВК Саюзу ССР усебеларускаму зьезду калгасьнікаў-ударнікаў

Менск, ЦВК БССР т. ЧАРВЯКОВУ—зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

Прэзыдыум ЦВК Саюзу ССР вітае зьезд калгасьнікаў-ударнікаў Беларусі, перадавых барацьбітоў за умацаваньне калгаснага ладу. Адзначаючы пасьпяховае завяршэньне веснавой сяўбы ў Беларусі, прэзыдыум ЦВК Саюзу ССР спадзяецца, што калгасьнікі Беларусі, сьледуючы ўказаньням тав. Сталіна, таксама пасьпяхова справяцца і з іншымі сельска-гаспадарчымі кампаніямі, у прыватнасьці з сена і збожжаўборкай і выкананьнем абавязацельстваў перад дзяржавай.

Вышэй ленінскі сьцяг, сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва! Наперад, да новых перамог!

Старшыня ЦВК Саюзу ССР — М. КАЛІНІН.

УЧОРА НА ЗЬЕЗЬДЗЕ

Менскі сад «Прафінтэрн» ужо ня раз бачыў вялікія урачыстасьці. І зараз ён зьяўляецца сьведкай вялізарнага сьвята працоўных БССР: адкрыўся другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў, які сушаў е XIII гадавіной вызваленьня Беларусі ад акупантаў.

630 дэлегатаў лепшых ударнікаў прыехалі на зьезд. А колькі іх, такіх-жа лепшых на сваёй ударнай работе, налічваюць нашы калгасы? Асабліва павялічыліся рады перадавых змагароў за ўмацаваньне калгаснага ладу ў часе барацьбы за ажыцьцяўленьне вялікіх задач першай бальшавіцкай вясны другой пяцігодкі.

Да паловы другой гадзіны дня ўсе дэлегацыі заняли ўказаныя ім месцы ў летнім тэатры. Упередзе размясьціліся дэлегаты СЛУЦКУ, ЧЫРВОНАЙ СЛАБАДЫ, БАРЫСАВА, РАГАЧОВА і інш. перадавых раёнаў, выпрымаўшых установленьня партыяй і ўрадам тэрміны сяўбы.

Дзьве гадзіны дня. За чырвоным сталом зьяўляецца старшыня СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕД. Шумныя гамонкі і песьні зьмяняюцца ўрачыстай цішынёй.

— Таварышы! Ад імя ЦК КП(б)Б і ўраду БССР перадаю дэлегатам калгасьнікам-ударнікам другога ўсебеларускага зьезду бальшавіцкае прывітаньне.

Гром апладысмэнтаў чуецца ў адказ на прывітаньне тав. Галадзеда.

— Другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў, — гаворыць т. Галадзед,—сабраўся на рубяжы двух ад казных перыядаў сельска-гаспадарчых работ. Мы ня так даўно скончылі веснавую сяўбу, пачалі праполку і стаімо перад пачаткам уборкі ўраджаю. Хоць мы і ня выпрымалі ўстаноўленага для нас партыяй і ўрадам тэрміну сяўбы, але ўсё-ж правялі яе больш арганізавана, лепш па якасьці апрацоўкі глебы, поўнасьцю выканалі плян амаль па ўсіх асноўных культурах і скончылі сяўбу на 20 дзён раней мінулага году.

У гэтым—вялікая перамога нашай барацьбы за сацыялістычны ўраджай. Але гэта перамога—толькі пачатак нашай упартай барацьбы за ажыцьцяўленьне лёзунгу т. Сталіна—зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а калгасьнікаў—самазкнымі. Упередзе больш ад казны, больш цяжкі перыяд барацьбы за ажыцьцяўленьне гэтага лёзунгу. Свачасова і добраякасна убраць, абмалаціць і здаць дзяржаве належную частку сельгаспрадукцыі—вось галоўная і першачарговая задача ўсіх нашых калгасаў.

— Я упэўнен, — заканчвае тав. Галадзед,—што калгасы БССР, заваёўваючы пярэдніства ў сацспаборніцтве з калгасамі Заходняй вобласьці ў першым туры барацьбы за сацыялістычны ўраджай, не аддадуць гэтага пярэдніства і ў другім туры.

Апошнія словы тав. Галадзеда пакрываюцца бурнымі апладысмэнтамі. Тав. Галадзед абвяшчае зьезд адкрытым. Для прапановы аб складзе прэзыдыуму зьезду слова атрымлівае калгасьнік Слуцкай дэлегацыі тав. ЕЛЬНІЦКІ.

Зьяўленьне на сцэне першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО і членаў бюро ЦК дэлегаты зьезду сустракаюць гучнымі воплескамі.

Аб складзе ганаровага прэзыдыуму зьезду прапанову ўносіць ад імя Менскай дэлегацыі калгасьнік тав. НАГОРНЫ. Прапанова аб выбраньні членам ганаровага прэзыдыуму тав. Сталіна выклікае буру апладысмэнтаў, пераходзячых у авацыю. Усе ўстаюць. Чуецца магутнае «ура».

Пасьля выбраньня прэзыдыуму, сакратарыяту, рэдакцыйнай і мандатнай камісіяй, тав. Галадзед уносіць на зацьвярджэньне зьезду прапанову аб падрыманьні ініцыятывы калгасьнікаў Гомельшчыны пра разгортваньне ЗБОРУ СРОДКАЎ НА ПАБУДОВУ АВІЯ-ЭСКАДРЫЛЬІ ІМЯ КАГАНОВІЧА. Прапанова прымаецца апладысмэнтам. Далей тав. Галадзед зачытвае тэлеграму, якая прыслана на імя зьезду тав. Калінінам.

З вялікім дакладам аб праполцы, уборцы, здачы збожжа дзяржаве і задачах калгасьнікаў выступіў спатканы бурнымі воплескамі сакратар ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧ.

НА ВЯЧЭРНІМ ПАСЯДЖЭНЬНІ з прамовамі выступілі народны камісар земляробства БССР т. БЭНЭК і начальнік палітычнага кіраўніцтва НКЗВ тав. ПЫЖЫКАЎ.

У спрэчках па дакладу т. Шаранговіча выказалася 11 чалавек — т. т. ЖАЎРЫН (Слуцкі раён), БЫЧКОЎ (Барысаўскі раён), ЛІТВІНАЎ (Шклоўскі раён), ВАСІЛЬЧАНКА, ГАРБАЧ, ДУБІНЕВА (Барысаўскі раён), ЧАРТКОВА (Полацкі раён), МАШКІЦЁНАК (Аршанскі раён) ТУПІЦА (Капыльскі раён), ЗАВАДЗКІ (Рагачоўскі раён) і дэлегатка ад Заходняй вобласьці т. БАЧАНКОВА (Гжацкага раёну, калгасу імя Леніна, узнагароджаная ў дзень 8 сакавіка ордэнам працоўнага сьцягу).

На зьезд прыбыла дэлегацыя ад Заходняй вобласьці на чале са старшынёй абласной камісіі па спаборніцтву з БССР т. ШЭЙДЛІНАЙ. У склад дэлегацыі ўваходзіць 5 калгасьнікаў ад ВЯЗЕМСКАГА, ГЖАЦКАГА, СМАЛЕНСКАГА, ПОЧЫНОКСКАГА І РОСЛАЎЛЬСКАГА РАЁНАЎ.

1. Задачы палітаддзелаў

Чыгуначны транспарт зьяўляецца галоўным нэрвам эканамічнага жыцьця краіны, матар'яльнай апорай для сувязі паміж горадам і вёскай, паміж прамысловасьцю, землярэбствам, паміж рознымі вобласьцямі СССР, нарэшце, для сувязі паміж тылам і фронтам. Аслабленьне чыгуначнага транспарту, перабоі ў яго рабоце азначаюць, з прычыны гэтага, аслабленьне ўсёй нашай гаспадаркі, аслабленьне і падрыў абароназдольнасьці краіны.

Сучасны момант характарызуецца тым, што на чыгуначным транспарце зьявіліся аднакі некаторага аспаблення работы, зьявіліся аднакі перабояў у рабоце. Пакуль яшчэ ня відаць, каб гэтыя трывожныя зьявы нарасталі. Але ня можа быць сумненьня, што калі яны пачнуць нарастаць, мы можам апынуцца перад небясьпекай падрыву ўсёй нашай народнай гаспадаркі, падрыву абароназдольнасьці краіны.

Самая вялікая небясьпека ва ўсім гэтым заключаецца нават ня ў тым, што зьявіліся аднакі аспаблення работы і перабояў на чыгуначным транспарце. Найбольш сур'ёзная небясьпека заключаецца ў тым, што работнікі чыгуначнага транспарту ў сваёй большасьці не заўважваюць, ня бачаць гэтых трывожных аднак, а хто бачыць, — стараецца іх замазаць, ня ўскрыць і ліквідаваць іх, а замазаць, замаўчаць.

Хто адказвае за недахопы чыгуначнага транспарту?

Зразумела, што адказнасьць кладзецца перш за ўсё і галоўным чынам на камуністаў і беспартыйных актывістаў чыгуначнага транспарту зьверху да нізу. Камуністы і беспартыйныя актывісты і толькі яны прызваны кіраваць чыгуначным транспартам. Яны-ж і адказваюць за яго безладзьдзе, за перабоі ў яго рабоце.

Дрэнная работа камуністаў і беспартыйных актывістаў — вось крыніца дрэнная работы чыгуначнага транспарту.

Каб падняць чыгуначны транспарт на належную вышыню і вывесьці яго на шырокую дарогу, работнікі транспарту павінны перш за ўсё падняць сваю кваліфікацыю, павінны вывучаць тэхніку справы, павінны аўладаць тэхнікай, павінны стаць знаўцамі і сапраўднымі гаспадарамі справы. А што мы маем на справе?

На справе поўзнайства і тэхнічная няпісьменнасьць як былі, так яны і засталіся за большасьцю камуністаў і беспартыйных актывістаў на транспарце. Шуму і самахвальства аб аўладаньні тэхнікай шмат, а сапраўднага аўладаньня тэхнікай усё яшчэ няма.

Каб вывесьці чыгуначны транспарт на шырокую дарогу і пакончыць з яго недахопамі, трэба падняць у ім дух сьвядомай дысцыпліны і працоўнага спаборніцтва ,трэба пакончыць з разгільдзяйствам і разьвіць у кожным работніку пачуцьцё найяліпшай адказнасьці перад краінай; трэба давіць таго, каб чыгуначны транспарт працаваў выразна і без перабояў як мэханізм гадзіньніка. А што мы маем на справе?

На справе — разгільдзяйства і расхлябанасьць, слабая працоўная дысцыпліна і перабоі ў рабоце транспарту ўсё яшчэ застаюцца ў нас не ліквідаванымі. Больш таго, камуністы і беспартыйныя актывісты ня рэдка ня толькі не процідзейнічаюць прагульшчыкам і іншым парушальнікам працоўнай дысцыпліны, а, наадварот, самі аказваюцца лодырамі і прагульшчыкамі.

Каб вывесьці транспарт на дарогу і падняць яго на належную вышыню, трэба весьці сыстэматычную барацьбу з клясавымі ворагамі на транспарце, з кулакамі і іншымі шкоднікамі, трэба прышчапляць работнікам транспарту пачуцьцё рэвалюцыйнай пільнасьці, трэба сьмела ўскрываць недахопы ў рабоце транспарту і выпальваць іх агнём добраясумленнай, бальшавіцкай самакрытыкі. А што мы маем на справе?

На справе палітычная сьлепата і наіўная добрадушнасьць у адносінах да шкоднікаў і іншых клясавых ворагаў, адсутнасьць самакрытыкі і трусьліваё замазваньне памылак у рабоце — усё яшчэ застаюцца ў нас характэрнымі рысамі многіх і многіх камуністаў і беспартыйных актывістаў на транспарце.

Няма патрэбы даказваць, што пакуль застануцца гэтыя абураючыя недахопы ў рабоце камуністаў і беспартыйных актывістаў транспарту, нямінуча будуць заставацца перабоі і прарэхі ў самым транспарце. Каб вывесьці чыгуначны транспарт на дарогу і падняць яго на належную вышыню, трэба ліквідаваць гэтыя ганебныя недахопы ў нашай рабоце.

Палітаддзелы на чыгуначным транспарце ствараюцца для таго, каб палегчыць і паскорыць вырашэньне гэтай актуальнейшай задачы.

Задача палітаддзелаў заключаецца ў тым, каб забясьпечыць на аснове перакананьня, мерамі арганізацыйнага і ідэйна-палітычнаг ўзьдзеяньня стварэньне на чыгуначным транспарце «сьвя домай, жалезнай дысцыпліны» (ЛЕНІН), новага магутнага падёму сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, узьняць усю партыйна-палітычную работу сярод рабочых і служачых чыгуначнікаў на вышэйшы ўзровень.

Задача палітаддзелаў на транспарце заключаецца, далей, у тым, каб разгарнуць барацьбу з клясава-чужымі і варожымі элемэнтамі (сабатажнікамі, злодзеямі, рвачамі, лодырамі і г. д.), выяўляць, выкрываць і гнаць іх з чыгуначнага транспарту, праводзіць неабходныя мерапрыемствы супроць раскрадваньня, забясьпечыць моцную ахову і беражлівае адносіны да дзяржаўнай сацыялістычнай уласнасьці.

Задача палітаддзелаў заключаецца, далей, у тым, каб арганізаваць справу сапраўднага аўладаньня тэхнікай чыгуначнага транспарту камуністамі і беспартыйнымі актывістамі, дапамагчы ім узьняць сваю кваліфікацыю і даць ім, такім чынам, магчымасьць стаць сапраўднымі гаспадарамі даручанай ім справы.

Выкрываючы і бязьлітасна выганяючы з партыйных і камсамольскіх арганізацый апартуністычныя і сацыяльна-чужыя элементы, якія вядуць падрыўную работу пад прыкрыцьцём партбілету, палітаддзелы павінны падняць ідэйна-палітычны ўзровень партыйцаў і беспартыйных актывістаў, іх вядучую ролю на транспарце, стараючы і згуртоўваючы зусім надзейны беспартыйны актыў вакол партарганізацый.

Забясьпечваючы партыйнае вока і кантроль ва ўсіх галінах чыгуначнага транспарту, палітаддзелы павінны весьці непрымірымую барацьбу з боязьню самакрытыкі і з канцылярска-бюракратычнымі мэтадам у кіраўніцтве чыгуначнага транспарту, дабіваючыся выразнай, апэрацыйнай работы, бязумоўнай выканальнасьці і адказнасьці ва ўсіх яго зьвяньнях, бязумоўнага і неадкладнага выпраўленьня ўскрытых памылак і недахопаў.

Аб палітаддзелах на чыгуначным транспарце

Пастанова ЦК УсеКП(б)

II. Палажэньне аб палітаддзелах

1. Правы і абавязкі палітаддзелаў

а) Палітаддзелы кіруюць на правах партыйных камітэтаў усімі партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі, кандыдацкімі групамі і групамі спачуваючых на чыгуначным транспарце, у тым ліку прыёмам у партыю.

б) Палітаддзелы разьмяркоўваюць партыйныя кадры на транспарце, зацьвярджаюць сакратароў ячэек, робяць перамяшчэньне камуністаў.

в) Начальнікі палітаддзелаў увязваюць сваю работу з мясцовымі партыйнымі камітэтамі, райкомам, абкомам, ЦК нацкампартыі, якія ў сваю чаргу абавязаны аказваць усямерную дапамогу палітаддзелам у іх рабоце, прычым, у мэтах устанаўленьня пастаяннай сувязі паміж імі нач. палітаддзелаў уключаюцца ў склад адпаведных партыйных камітэтаў (райкому, абкому, ЦК нацкампартыі).

г) Функцыі кантрольных камісій у адносінах камуністаў-чыгуначнікаў пераходзяць у спэцыяльна-арганізуемыя пры палітаддзелах парткамісіі раёнаў і дарог, назначаемыя ЦКК УсеКП(б).

2. Структура палітаддзелаў

А) Паліткіраўніцтва НКШЗ

У НКШЗ арганізуецца паліткіраўніцтва ў складзе: начальніка, яго намесьніка і двух памочнікаў.

Начальнік паліткіраўніцтва зьяўляецца намесьнікам народнага камісара па палітычнай частцы і падначальваецца як наркому, так і непасрэдна ЦК УсеКП(б).

Паліткіраўніцтва НКШЗ кіруе работай палітаддзелаў дарог і раёнаў. Начальнік паліткіраўніцтва НКШЗ назначаецца і звальняецца ЦК УсеКП(б).

Б) Палітаддзел чыгункі

Палітаддзел чыгункі арганізуецца ў складзе: начальніка, яго намесьніка і аднаго памочніка.

Начальнік палітаддзелу дарогі зьяўляецца намесьнікам дырэктара дарогі па палітычнай рабоце і адначасова падначальваецца начальніку паліткіраўніцтва НКШЗ.

Начальнік палітаддзелу дарогі кіруе работай палітаддзелаў раёнаў, парторгаў дэпо, заводаў і важнейшых чыгуначных вузлоў.

Начальнікі палітаддзелаў дарог назначаюцца і звальняюцца ЦК УсеКП(б) па прадстаўленьні начальніка паліткіраўніцтва НКШЗ.

В) Палітаддзел чыгуначнага раёну

Палітаддзел чыгуначнага раёну арганізуецца ў складзе: начальніка, яго намесьніка і яго памочніка.

Начальнік палітаддзелу раёну зьяўляецца намесьнікам начальніка раёну па палітчастцы і адначасова падначальваецца начальніку палітаддзелу дарогі. Ён кіруе ячэйкамі чыгуначных вузлоў і станцый, а таксама дыстанцый шляху і сувязі.

Начальнікі палітаддзелаў раёнаў назначаюцца і звальняюцца ЦК УсеКП(б) па прадстаўленьні начальніка паліткіраўніцтва НКШЗ.

Г) Аб чыгуначных вузлох і заводах НКШЗ

На важнейшых чыгуначных вузлох і на заводах НКШЗ (па сьпісе, які зацьвярджаецца ЦК) уводзіцца інстытут парторгаў, непасрэдна падначаленых начальніку палітаддзелу дарогі.

Парторгі чыгуначных вузлоў і заводаў назначаюцца і звальняюцца ЦК УсеКП(б) па прадстаўленьні начальніка паліткіраўніцтва НКШЗ.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БАЛЬШАВІКОЎ).

10-га ліпеня 1933 г.



НА ЗДЫМКУ: 1. Дзяржбібліятэка імя Леніна. 2. Галоўны корпус студэнцкага гарадку. 3. Касьцюковіцкая гута (Гомельскі р.). 4. Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат. 5.

13 ГАДОЎ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАЙ БАРАЦЬБЫ ПРАЦОЎНЫХ МАС ЗАХ. БЕЛАРУСІ

13 гадоў вызваленьня БССР ад беларускай — гэта слаўны гістарычны этап буйнага росту беларускай культуры, нацыянальнай па форме і пралетарскай, сацыялістычнай па зьместу, 13 гадоў буйных дасягненьняў у галіне асьветы, школьніцтва, выдавецтва, тэатру, мастацтва.

Гэтыя дасягненьні магчымы былі дзякуючы і на аснове небывалых посьпехаў у справе індустрыялізацыі БССР і сацыялістычнай перабудовы і ўзьнёсьця на вышэйшы ўзровень нашай сельскай гаспадаркі.

Зусім іншы за гэты час малюнак мы бачым на тым баку мяжы—у Заходняй Беларусі. Поўны заняпад прамысловасьці, дарадчая сельская гаспадарка, беспрацоўе, галеча шырокіх працоўных мас гораду і вёскі—характарныя адзнакі сучаснай Зах. Беларусі. Тое самае ў галіне культурна - асьветнай: зьнішчэньне беларускага школьніцтва, спыненьне выдавецтва беларускіх прэсы і кніжак, амрача, эразумела, незначнага ліку нац.-фашысцкіх, ды пэрагу дафэн выгуных выданьняў у беларускай мове. Пры жорсткім панскім тэрэры і ўціску, эразумела, ня прыхоўваецца гаварыць аб сяраднім (зьліквідаваны дзьве апошнія гімназіі ў 1932 г) і вышэйшых беларускіх школах, і аб сталым беларускім тэатры.

Усё гэта—рэзультаты сыстэматычнай палёнізацыйнай палітыкі, адносна няпольскіх нацыянальнасьцяй, а ў першую чаргу—адносна беларусоў.

Працоўныя масы Заходняй Беларусі, зядучы непарастанную гераічную барацьбу за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне, адначасова не перастаюць змагацца супроць палёнізацыйнай палітыкі польскай буржуазіі, супроць беларускіх нац.-фашыстаў—Луцкевічаў, беларускіх хадэкаў і г. д.

Праваднікамі палёнізацыйнай палітыкі польскай буржуазіі на мейсцы выступаліся ў першую чаргу польскія абшарнікі, асадзікі і ксяндзы, разам з пасланымі польскімі настаўнікамі, паліцыяй, чыноўнікамі і шпікамі. «Вызваленьне», «П. П. С.» і іншыя сацыял і народна-фашысцкія партыі, стараліся пры дапамозе дэмагогіі ўвайсьці ў даверэ працоўных мас, а разам з тым пасцупова палёнізаваць іх. Але манэўры гэтых палітычных шулераў сталі выкрывацца кампартыяй Зах. Беларусі і нацыянальна-вызваленчымі арганізацыямі, дзякуючы чаму працоўныя масы пасцупова сталі адыходзіць ад іх, а іх агентаў гнаць вон. Ужо ў 1925 г. мы бачым, што названыя партыі на Зах. Беларусі былі ў асноўным адэмаскаваны і ў многіх мясцовасьцях страцілі свой уплыў сярод працоўных мас.

Аднак польская буржуазія карыстаючыся далей гэтымі партыямі, стараецца ўсямерна падтрымаць гэтыя так званыя культурна-асьветныя і гаспадарчыя арганізацыі, якія служаць польскім палёнізацыйным мэтам на Зах. Беларусі. Праз іх, як праз прыводныя рамені, імкнуцца разграміць беларускія культ-асьветныя арганізацыі працоўных мас, а насельніцтва, галоўным чынам моладзь, ахапіць сваім уплывам.

Калі возьмем апошні год, дык убачым, што розныя «кулкі стральцоў», «кола вясковай моладзі» і г. д. сталі праяўляць вялікую рухлівасьць, стараючыся накрыць густой сеткай сваіх гурткоў усю Зах. Беларусь.

Гэтыя арганізацыі, ня гледзячы на сваю разнашэрснасьць і нібыта розныя заданьні, на сутнасьці імкнуцца да адной мэты — да хутчэйшай палёнізацыі беларускага і іншага няпольскага насельніцтва.

681 вясковых польскіх тэатраў, якія існуюць на ЗВ у большасьці сваёй арганізаваны настаўніцтвам пры польскіх школах. Гэтае-ж настаўніцтва ў асноўным зьяўляецца і арганізатарамі цэлай сеткі хораў, якія налаўчаюць валасныя, раённыя і павятовыя «сьвяты песьні».

Аб тым, якія гэта песьні і што праз іх хочуць прышчапіць беларускаму насельніцтву палёнізатары, гаворыць нас тупны абавязковы па Віленскай школьнай акрузе (а таксама і па іншых) рэцэртуар: 1) «За нашым водзэм», 2) «Ойчэ з небёс, божэ, пане», 3) «Ой, земё», 4) «Улані» і г. д. і г. д.

Для беларусоў і літоўцаў, каб заахвоціць іх да наведваньня, уведзена «Лявоніха» (бел.) і «Сукцінес» (літ.), якія дэманструюцца адначасова з польскімі песьнямі і танцамі.

Усе гэтыя арганізацыі для правядзеньня сталай і сыстэматычнай працы па палёнізацыі насельніцтва адчыялі цэлы шэраг так званых «сьвятліц» («народныя дамы»). Як падае буржуазная прэса, у Навагрудзкім і Віленскім ваяводствах такіх «сьвятліц» налічваецца 904.

Вышэйпаказаныя лічбы я прывёў дзеля таго, каб паказаць тую шырокую акцыю, якую праводзіць фашызм на ЗВ і тыя значныя сродкі і энэргію, якія затрачаны на гэту справу.

Як-жа адносіцца да гэтай новай атакі беларускае насельніцтва?

У большасьці ўсе гэтыя «тэатры» і «сьвятліцы» абслугоўваюць галоўным чынам наплыновы польскі элемэнт, як асадзікаў, ураладуцаў. Жывы і актыўны ўдзел у гэтым прымаюць ксяндзы, афіцэры арміі, абшарнікі, шляхта і, эразумела, агентура паліцыі як у вёсках, так і ў горадзе. У апошнія гады можна заўважыць цеснае супрацоўніцтва і беларускага кулацтва. Што гэты чыцца беларускіх працоўных мас, то яны ў сваёй пераважнай большасьці баікатуюць гэтыя арганізацыі і іх імпрэзы.

Актыўна дапамагае польскім арганізацыям нац-фашысцкая крамка Астроўскага, Луцкевіча і Ко. Дзеля таго, што старая назва мецца скампрамэтавана, яна перафарбоўваецца. Мяняецца назва газэты з «Народнага Звону» на «Родны Край», сама арганізацыя называецца «Т-ва Беларускай Асьветы» (ТБА). Гэтай назвай яны хацелі падышыца пад шыльду папулярнай на ЗВ культасьветнай арганізацыі Т-ва Беларускай школы (ТБШ).

ТБА распачала сваю працу заявай аб апалітычнасьці. Адным з яго галоўных заданьняў лічыцца нібы ліквідацыя няпісьменнасьці сярод беларускага насельніцтва, праца сярод «радных беларусоў на грунце самаўрадаў — гмінных і ўсенных».

Гэты новы манэўр «апалітычнасьці» Луцкевіча і Ко быў патрэбен дзеля таго, што старыя метады праваліліся, твар нац.-фашыстаў быў адэмаскаваны.

Новая арганізацыя распачала працу адчыненьнем гурткоў, бібліятак і г. д. Трэба адзначыць, што ў гэтай працы даволі актыўны ўдзел прымае паліцыя, дапамагаючы сваёй агентуры. Прыкладам можа служыць частушны факт: калі сяляне вёскі Кожава, Журавіцкай вол., Стаўпецкага пав. хацелі залажыць гурток ТБШ, то паліцыя намаўляла закладчыкаў адмовіцца ад гэтага, а запісацца ў ТБА. Падобных прыкладаў супрацоўніцтва можна было-б прывесьці цэлы шэраг.

Ажыўляецца праца «Беларускага інст. гаспадаркі і культуры» (арганізацыя беларускай хадэцыі) і дабыта з архіву, пасьля двухгадовага перапынку, дэфэнзыўная «Прасьвета». Новым момантам ёсьць — узмоцненыя патугі польскай буржуазіі апанаваць ТБШ. Вядомы на Беласточчыне шпік Высакінскі зьбірае прадстаўнікоў гурткоў ТБШ, ад якіх вымагае пагрозамі супрацоўніцтва з польскімі арганізацыямі, абяцаючы да гэтага сваё падтрыманьне і даючы дазвол на сход, або на спэктакль. Гэтым дэфэнзыўным нашкам стараліся апанаваць паасобнымі зьвеньнямі ТБШ, а праз іх і ўсёй арганізацыяй.

Новая тактыка фашызму мела той вынік, што менш сьвядомыя сябры гурткоў, а нярэдка і цэлы гурток ішлі на гэтую ўгоду і супрацоўнічалі з фашысцкімі арганізацыямі. Нават сярод часткі членаў галоўных устаноў ТБШ бачым значныя хістаньні (працэс ТБШ).

Польскі фашызм стараецца дзе адкрыта — пялтам, а дзе манэўрамі даняць свае мэты — хутчэйшай палёнізацыі ЗБ.

Разграміўшы беларускае пачатковае школьніцтва (зачынена больш 400 школ), зачыніўшы ўсе 7 гімназій, якія існавалі з пачатку захопу, ён вядзе шалёны наступ на рэшткі культурна-асьветных беларускіх арганізацый працоўных мас.

Гэтаму націску польскай буржуазіі, беларускага нац.-фашызму і дэфэнзыўнай агентуры супроцьстаўляецца няломная воля беларускіх працоўных мас, якія пад кіраўніцтвам КПЗВ вядуць упартую барацьбу з нацыянальным прыгнечаньнем барацьбу за свой Кастрычнік.

Ня гледзячы на жорсткія ўдары, гурткі ТБШ з вялікай упартасьцю працягваюць сваю працу і надалей, перамагаючы тысячы перашкод, якія робяць як паліцыя, так і адміністрацыя.

Процістаўляючыся палёнізацыі, беларускія працоўныя масы не пакідаюць дамагацца беларускай школы, гуртуюц ца каля сваёй арганізацыі — ТБШ.

Побач з ростам рэвалюцыйнай хвалі, побач з ростам нацыянальна-вызваленчага руху, расьце сацыяльная і нацыянальная сьвядомасьць, падымаецца на вышэйшую ступень і барацьба за пралетарскую беларускую культуру, за школу ў роднай мове.

МЯТЛА.

РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РУХ НА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Кожную гадавіну вызваленьня Савецкай Беларусі ад белапалякаў мы ня толькі падводзім вынікі пройдзенага шляху ў БССР і канцэнтруем увагу працоўных на лічэ нявырашаных задачах сацыялістычнага будаўніцтва, але адначасова мы робім агляд становішча працоўных мас Заходняй Беларусі, агляд іх рэвалюцыйнай барацьбы за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне.

Некалькі дзесяткаў кілёмэтраў аддзяляюць сталіцу БССР ад мяжы, за якой знаходзіцца другі сьвет, сьвет капіталістычнай і абшарніцкай няволі, сьвет страшэннай галечы рабочых і працоўных сялян, сьвет дэградаваных і раскіданых працуючыя сіл, сьвет васуцжаны гісторыяй на гібель.

Рабочыя і працоўныя сяляне Заходняй Беларусі вядуць шлях перамогнай рэвалюцыі ў СССР і БССР, карыстаючыся досьледам пралетарыяту былой царскай Расіі ў сваім штодзённым змаганьні. Яны ў цесным сувязі з рэвалюцыйным рухам працоўных Польшчы вядуць упартую гераічную барацьбу з польскім капіталізмам і фашызмам.

Польская буржуазія што раз больш цяжары ўскладае на плечы рабочых і працоўнага сялянства для выратаваньня сыстэмы наймовага рабства, сыстэмы капіталістычнай анархіі, голаду, беспрацоўя і імпэрыялістычных войнаў.

Сённяшняя барацьба рабочых і сялян Заходняй Беларусі прадстаўляе сабой далейшае разьвіцьцё рэвалюцыйнага ўздыму апошніх год.

«Польшча ўжо пачынае падыходзіць да рэвалюцыйнага крызісу. Гэта знаходзіць сваё выяўленьне ў шырокім размаху баявога адпору пралетарыятам шалёнаму наступленьню капіталу, у нарастаньні аграрнай рэвалюцыі ва ўсёй Польшчы, сялянскіх і нацыянал-вызваленчых паўстаньнях супроць акупацыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны», гаворыцца ў рэзалюцыях VI зьезду КПП і VI пленуму КПЗБ і ход падзей на Заходняй Беларусі і ў Польшчы поўнасьцю пацьвердзіў гэтыя словы сказаныя яшчэ ў канцы 1932 г.

Рэвалюцыйныя баі на Заходняй Беларусі ў 1933 годзе адзначаюцца яшчэ больш цеснай увязкай з уздымам рэвалюцыйнай хвалі ў Польшчы, сустаўной часткай якой яны і зьяўляюцца. Узрасла кіруючая роля пралетарыяту і паўпралетарскіх элемэнтаў вёскі. Узрастае і ўмацоўваецца саюз рабочых і сялян.

Апошняя забастоўка беластоцкіх тэкстыльшчыкаў зьяўляецца найдаўжэйшай і найбольш баявой забастоўкай тэкстыльшчыкаў сучаснай Польшчы. Найважнейшай рысай яе зьяўляецца той факт, што гэты вялікі клясавы бой меў рэвалюцыйнае кіраўніцтва, стварэнае на аснове адзінага фронту. Ён меў яўна палітычны характар і выклікаў масавыя забастоўкі салідарнасьці ва ўсёй Заходняй Беларусі, забастоўкі з выразнай тэндэнцыяй перарастаньня ва ўсеагульную забастоўку на ўсёй ЗБ.

Асаблівай увагі заслугоўваюць таксама забастоўкі лесарубаў Белавежы і возчыкаў Пруканскага і Слонімскага паветаў. Чырвоная Гайнаўка за 1932 і 1933 гады тры разы ўступала ў забастовачныя баі. Апошні раз—у знак салідарнасьці і дапамогі беластоцкім тэкстыльшчыкам. Лесарубы ва ўмовах распыленасьці (яны былі раскінуты на тэрыторыі ў 1.000 кв. км.), праявілі небывалую энэргію, рэвалюцыйную настойлівасьць у барацьбе і, што асабліва трэба падкрэсьліць, здолелі арганізаваць шырокія сялянскія масы на дапамогу бастуючым. Шляхам салідарных выступленьняў, байкоту штрэйкбрэхераў і матар'яльнай дапамогі бастуючым лесарубам, сяляне выказалі сваю рэвалюцыйную салідарнасьць.

Забастоўкі апошняга часу ў Польшчы адначаюцца паміж іншым і тым, што ў іх усё часьцей ужываецца мэтад захопу фабрык, г. зн. рабочыя абвяшчаюць забастоўку і на ўсім яе працягу ня выходзяць са сьцепаў заводаў і фабрык, вядучы жорсткую барацьбу з адміністрацыяй і паліцыяй, якія стараюцца выкінуць іх з будынку фабрыкі. З гэтым захопам фабрык рабочымі мы пачынаем сустракацца і на Заходняй Беларусі (Горадня), ня гледзячы на тое, што ва ўмовах адсутнасьці па ЗБ вялікіх заводаў, гэты захоп прадстаўляе даволі вялікія труднасьці.

Барацьба беластоцкіх тэкстыльшчыкаў і гайнаўскіх лесарубаў—гэта найбольш яркія прыклады ўздыму і абвастрэньня забастовачнай хвалі на Заходняй Беларусі.

Выступленьні працоўнага сялянства якія часта паўтараюцца ў апошнія часы на ЗБ, накіраваныя ня толькі супроць эксплёатацыі польскіх памешчыкаў і капіталістаў, але і супроць беларускай буржуазіі і кулацтва. Барацьба на глебе страшэннага голаду і падатковых цяжараў, камасацыі, ліквідацыі сэрвітутаў г. зн. супроць усёй палітыкі польскага фашызму на ЗБ прымае ўсё-больш шырокія разьмеры, усё больш арганізаваны характар. Надзвычайныя суды і пыбеніцы ўжо ня могуць справіцца з нарастаючай аграрнай рэвалюцыяй. На дапамогу ім выступаюць карныя экспэдыцыі, якія на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне сталі штодзённым зьявішчам. У канцы 1932 і пачатку 1933 году больш 10 раёнаў ЗБ, у тым ліку Камень-Кашырскі (Палесьсе), Індурскі (Гарадзеншчына), Гарадоцкі (Беласточчына), Дамачоўскі (Пінішчына) былі ахоплены гэтымі карнымі экспэдыцыямі, або як іх афіцыяльна называюць «пацыфікацыяй», якая добра вядома працоўным масам Савецкай Беларусі з часоў прабываньня тут белапольскіх легіёнаў генэрала Доўбар-Мусьніцкага і інш.

Аднак, і гэты новы сродак барацьбы —карныя экспэдыцыі—ня можа спыніць нарастаючага рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху на ЗБ. Ён бязупынна ўзрастае і абвастраецца. З кожным днём пашыраецца ўплыў авангарду пралетарскай рэвалюцыі—камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, якая моцна вырасла за апошнія часы. V і VI пленумы яе зьяўляюцца прыкладам канкрэтнага кіраўніцтва масавай барацьбой і доказам далейшага замацаваньня і паглыбленьня яе ўплыву сярод шырокіх працоўных мас, далейшага паглыбленьня балшавізацыі самой партыі.

Мацнее таксама і кіраўніцтва КПЗБ нацыянальна-вызваленчым рухам і барацьбой з беларускім нацыянал-фашызмам, родным братом якога зьяўляюцца нацдэмы ў БССР.

У 13-ю гадавіну вызваленьня БССР ад белапалякаў рабочая кляса і працоўнае сялянства Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам бальшавіцкай кампартыі ідуць з расгорнутымі чырвонымі сьцягамі да пабудовы бясклясавага грамадзтва. Там на Заходняй Беларусі—яны ідуць да свайго Кастрычніка. Іх і наша барацьба, хоць і на двух розных франтох змаганьня, накіравана да адной супольнай мэты —да зьнічэньня капіталізму і перамогі новага камуністычнага ладу на ўсім сьвеце.

К. А.

АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ

Дзе ўчора закінуты стыў пустыр...

Дзе ўчора закінуты стыў
пустыр,
Дзе пылам пакрытая дзіч
векавала,
Вырастае горда каменная
шыр —
Веліч рабочых кварталаў.

Расчынены сонцам вароты
вясны,
Наш росквіт праявай вандруе
па сьвету...
Растуць камяніцы, як помнік
яны
Жыцьця перамог і расьцьвету.

З работы шырокім праспэктам ішоў
Ударнік — таварыш Савёнак.
Ён бачыў, як зорочнага вечару шоўк
Дрыжэў ад трамвайнага звону.

Ён бачыў нібы пераклічку агню
У кнігарнях, фасадах і хатах.
І крык успаміну нібы ўпяршыню
Зьліваецца з гулам узьнятым.

Калісь толькі вецер байдосваў кусты
І выў, як паранены воўк перад скопам.
Было на работу прышоў на пустыр
Першым — таварыш Савёнак.

Дзірван ён крануў і ўсхвалёваны стаў,
З вачэй—плыў агонь па маршчынах
І гэтак пісьмела журбой прабягаў,
І гэтак нядоўга, хвілінай.

Дымілася маліновы золак зары,
А ў горадзе гомонам чад непагоды.
На гэтым забытым людзьмі пустыры,
Было яшчэ ўлетку дваццатага году —

Сіла на сілу пайшла на дыбы,
Злосьцю крыві захлынулася бойка.
Дзень той ніколі ў жыцьці не забыць —
Дзень славы чырвонага войска.

Ворага гналі, а горад—што корч —
Тлеў на кастлявых руках сутаренькаў,
І дзень і ў змаганьні лютнёвая ноч
Зьявілі заравам вызваленьня.

Той ноччу і сын, а ён быў партызан,
А іх многа—галодных, разьдзетых.
Жыцьцё іх забраў, кроў выліў іх пан
За росквіт народам Саветаў.

Ружовай расой быў заліты пустыр,
Гэта сьлёзы вайны... А ў памяці нашай —
Хвілінаю плавіцца наступу стынь
Акордам хаўтурнага маршу.

І там, дзе закінуты стыў пустыр,
Дзе ў громах грымотных вясна наступала,
Вырастае горда каменная шыр —
Веліч рабочых кварталаў.

Плятуцца ўспаміны ў вянкі—карагод,
Таварыш Савёнак дарогай з заводу
Згадаў вызваленьня дваццаты год
І даўнія, чорныя, лютыя годы.

Ён бровы нахмурыў і ў вузел маршчын
Вялікую крыўду здавілі ўспаміны.
Нянавісьць, як жвір пад нагамі хрушчыць,
Уздрогнуў і рэзка ўспаміны адкінуў.
— Памяць аб прошлым дапчэнту змалоць,
Уславім дзён новых раскаты.
Цяпер —
калі ласка —
у госьці заходзь,
Збудована новая хата.

Хай песьні пяюцца аб тым пустыры,
Дзе сьмерць усьцілала масты ў завірусе.
Цяпер —
калі ласка —
жывуць змагары,
Бальшавікі Беларусі.

Ліпень 1933 г.

ЗАКЛАДКА ФУНДАМАНТУ ВЯЛІКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРУ БССР

Архітэктар Лаўроў—аўтар праекту

Згодна пастановы ЦК КП(б)В і СНК БССР, у Менску пачаў будавацца вялікі тэатральны будынак. Гэта мерапрыемства — пачатак вялікай справы на фронце нацыянальна - культурнага будаўніцтва. Вялікі рост і разьвіцьцё ў БССР тэатральнай справы выклікае неабходнасьць стварэньня новай тэхнічнай базы. Старыя тэатральныя будынкі з прычыны сваіх малых разьмераў, непрыстасаванасьці і дрэннага тэхнічнага абсталяваньня ні ў якім разе не адпавядаюць цяперашняму буйному росту тэатральнага мастацтва і ня могуць задаволіць культурных запатрабаваньняў працоўнага гледача.

Новы тэатральны будынак будзе абсталёван паводле апошняга слова тэхнікі, будзе цалкам адпавядаць савецкаму тэатральнаму мастацтву.

Будынак новага вялікага дзяржаўнага тэатру запраектаваны на пляцы Парыскай камуны, з наступовым пераносам двух прылягаючых да пляцу кварталаў для стварэньня агульнай тэатральнай плошчы. На пляцы, наякол тэатру будзе ўтворана паласа — шырынёй у 35 мэтраў, для праходу дэманстрацый. Пасьля паласы зялёных насаджэньняў і вялікага зялёнага сквэру будзе пабудавана вялікая плошча для ваенных парадаў і інш. масавых дзеяньняў. Плошча заканчваецца спускам да Пралетарскай вулі цы 40 ступенямі з 4 пляцоўкамі, даўжынёю па 40 мэтраў.

Уся кампазыцыя праекту падзяляец да на дзве часткі: частка гледачоў і частка сцэнічная. Частка для гледача пачынаецца з 3-х вестыбюляў: сярэдняга, галоўнага і двух бакавых. Праз галоўны вестыбюль уваходзяць і выходзяць гледачы, якія займаюць месца ў сярэдзіне ад аркестру да апошняга раду партэру, які ўмяшчае ў сабе 1.850 месц.

Заля для гледача мае форму ўсечанага кола і запраектавана супольным партэрам. Усе месцы арыентаваны на сярэдзіне галоўнай сцэны са строга пэрпэндыкулярным праменем ад любога месца партэру. На ўзроўні 3-га паверху запраектаван поніс адкрытых 17 лёжаў для арганізацый і ўстаноў. Агульная ўмяшчальнасьць залі для гледачоў—2.250 чалавек.

На першым паверсе на ўзроўні вэстыбюляў запраектаваны пакоі абслугоўваючага характару. На 2-м і 3-м паверсе па кругавому дыямэтру залі разьмяшчаюцца—галоўнае файе, чатыры буфэты, чатыры курыцельныя файе, выставачная заля, музэй, прыбі ральні.

Чацьверты паверх занят цалкам кіно-асьвятляючай галярэяй, якая будзе знаходзіцца па ўсім пэрымэтры залі. Прызначэньне гэтай галярэі—праспаваць сьвятло і кіносцэнічныя моманты на любы пункт залі і сцэны і стварыць шырокія магчымасьці сьветлавых эфэктаў. На адным ўзроўні з падлогай кіно-галярэі знаходзіцца акружаючы яе плоскі дах, адкрыты для ўсіх гледачоў. Тут-жа знаходзяцца адкрытыя пляцоўкі для выступленьняў артыстаў у часе рэвалюцыйных сьвят.

З вялікага двухсьветлавога файе і 2-х буфэтаў другога паверху выходзяць адкрытыя бальконы на плошчу для гледачоў, а таксама і для дэманстрацый.

Да тэатральнай плошчы з боку Шырокай вуліцы будзе прымыкаць ўнутрыгарадзкі парк культуры і адпачынку, які будзе знаходзіцца ўсходзіць ракі Сьвіслачы да злучэньня яго з існуючым паркам «Прафінтэрн».

Новы будынак тэатру, незалежна ад яго прызначэньня, як тэатру оперы і драмы, будзе скарыстан і для вялікага кіно.

У вогуле ў тэатры адначасова будзе зьмяшчацца 4.500 чалавек.

Аб'ём будынку арыентовачна раўняецца 150.000 куб. мэтраў. Кошт тэатру—вызначаецца каля 10 млн. руб.

Усе работы па распрацоўцы рабочых чарцяжоў як агульнабудаўнічых, так і спэцыяльных вядзе Белдзяржпраект. Ім арганізаваны спэцыяльныя групы праектыроўшчыкаў, якія працуюць пры ўдзеле лепшых спэцыялістаў Саюзу ССР.

Згодна складзенага Белдзяржпраектам праекту арганізацыі работ, пабудова Вялікага тэатру павінна быць закончана да I-X-1936 году.

Для агульнага кіраўніцтва пабудовай тэатру ўрадам БССР арганізована спэцыяльны гарадзкі камітэт у колькасьці 16 чалавек на чале са старшынёю Савету Народных Камісараў БССР —тав. М. М. Галадзедам.



Праект Вялікага Дзяржаўнага тэатру БССР.

ПЯТРО ГЛЕБКА

Дваццаты год

(ГЕРАІЧНАЯ ПАЭМА)

Быў векапомны дваццаты
год...
Краіна Саветаў канчала
франты:
Правёўшы вялікі і слаўны
паход,
Чырвонае войска вярталася
ў тыл.

Раптам сыгнал на трывогу
падняў:
Ядай, пралетары, ізноў
на каня.
У рукі вінтоўку бяры,
селянін,
Выходзьце краіну сваю
бараніць
Ці новай навалы, ад польскага пана,
Што чыніць расправу над
людам забраным.

З фабрык, заводаў выходзяць мільёны,
Скрозьца моўчкі ў густыя калёны,
І маткі старыя, і сёстры — ізноў
ласкава праводзяць братоў і сыноў:

— У добрую часіну,
шчасьлівы табе шлях.
Глядзі-ж, мой любы сыне,
не забывай сяла.

— Я стану, мой каханы,
чакаць цябе дамоў, —
як скрышыце вы пана
і панскае ярмо.

На гэты ласкавы і просты наказ
Чырвонаармейцы даюць свой адказ.

— За нашую волю...
— За нашую працу...
— За нашу зямлю...
— І за вашае права —
Мы будзем да скону,
да сьмерці змагацца
і агнём адважна,
і агнём са славай.

І посьле, праз холад і ноч ідучы,
яны запяваюць звычайную песьню,
і чаршам грамовым над лесам лучыць
яго вечы каханай журботная песьня:

Ня журыся горненька
і ня плач,
што са мною, любая,
ня была.

Каб былі шчасьлівыя
нашы дні —
Я пашоў рэспубліку
бараніць.

І ня будуць ворагі
панаваць,
пакуль з плеч ня сконіцца
галава.

А калі і суджана
мне ня жыць —
ня журыся горненька,
ня тужы.

Словам добрым, ласканым
памяні
і выходзь рэспубліку
бараніць.

Праз горы і нетры, праз поле і лес,
ладзецца чырвонае арміі сьлед.

А там, аж за Віслай, вісіць ціпіня,
арол над прасторамі крылы разьняў.
І раптам прасторы прарэзвае крык:

— За што-ж цябе гоняць на сьмерць каждзяры?
Паночку!
— Адстань!

Маладая салдатка
схапіла за рукі ў бялёных пальчатках:

— Паночку!..
Нам славы чужое ня трэба,
мы самі заробім кавалачак хлеба...
Куды-ж вы пагналі яго, як бадзяку?!.

— Айчызьне сягоньня патрэбны вялікі,
а хлеба... на гэта ёсьць пан-бог над сьветам!

Паручнік прайшоў, адапхнуўшы кабету,
а тая, прышаўшы да чорнай зямлі,
галосіць, што мужа на сьмерць пагнялі.

На плошчы ксяндзы і пазы дэмакраты
жалосьлівым словам частуюць салдатаў:

— Каханыя дзеці! Каханыя дзеці!
У бой за айчызну адважна ідзеце.
За пана-за бога, за нашую веру
аддайце жыцьцё сваё, мужва, жаўнэры!
І вас не акіне айчызна, панове,
за вашу адвагу і вашы галовы.

Сівы генэрал прыпыняе малебен:
— Салдату жалосьлівы тон не патрэбен,
вы цьвёрдай рукой загартоўвайце дух...
Настройце, палкоўнік, хутчэй чараду!

— Сказалі настройць... Я слухаю пана!
Раў-нуй-ся! А-ну! Запявайце, уланы!

І моўчкі салдаты галовы панесьлі
пад гукі чужыя чужынскае песьні:

Стройся, уланы, у калёны,
пойдзем бацькаўшчыну броніць.
Гэй, гэй, ха-ха,
пойдзем бацькаўшчыну броніць.

І каго ня возьме куля,
прыдзе панам да матулі.
Гэй, гэй, ха-ха,
прыдзе панам да матулі.

А каторы ляжа крыжам,
на тым сьвеце бог заліша.
Гэй, гэй, ха-ха,
на тым сьвеце бог заліша.

Бадзёрыя ўланчыкі
на бой ідуць,
а змораных, спрацаваных —
на сьмерць вядуць.

Ні фабрыкаў,
ні фольваркаў,
у іх няма,
адно — гарбы высокія
ад панскага ярма.

І жоўты з іх, як парабак
ідзе ў страі.
Мілюнак хаты беднае
ў вачу стаіць.

Галодныя, бяздольныя
іх дзеці там.
І маткі над калыскамі
сьпяваюць так:

Сыні, мой сынку,
сыні, каханы,
бацька ў войска твой забраны,
а за што яго пагналі —
мне ні слова не сказалі.
Сыні, мой сынку,
сыні, каханы!

Ні зямлі,
ні гаспадаркі,
апрача арма на жарку,
мы ня маем, любы сыне,
дык за што-ж у бойках гінуць
на далёкай
на чыжуне?!

Сыні, расьці,
мой сын каханы,
каб ты мог, як большым станеш,
аддляціць паном праклятым,
за пакуту твайго таты.
Сыні, мой сынку,
сыні, каханы...

Над музыку плачу,
праклёны і лямянт,
пад крыкі нядолі,
пад стогны і енк —
едуць малойчыкі,
едуць уланы,
белая армія
валіць пад Менск.

Насупраць, з усходу,
пад гучныя маршы,
пад кліч прынітальны,
як вецер, як дзень, —
жвавымі стройнымі
армія наша
такжа кірунак
трымае на Менск.

Зоры ўсходзяць і зоры заходзяць,
грайчы зямлю высьцілае туман,
толькі чырвоным байцом у паходзе
ніколі ні сну, ні спачынку няма.

Вуха прыложыць да самага долу,
і чуе камрот, як галосіць лаза —
гэта зьбіваюць сялян за нядолю,
шатуюць матку, што сын партызан.

— Ты, старая, —
сама бальшавічка!..
І цябе прычакае асіна яшчэ...
І жанчына гаворыць з пакорай прывычнай:
— За вяроўку хапайся і вешай хутчэй...

Мы спазналі пакуты бяз меры і краю,
але гэтак яшчэ — аніхто ня тужыў:
цяжка мне, што я сілы ня маю,
каб сваімі рукамі цябе задушыць!

— Змоўкні, сьцерва!
— Ня гойкай, паночку,
не пачуеш ні слова больш...

Вязунамі на вёстужкі пасеклі сарочку,
а яна не сказала ні слова пра боль.

Гэты боль вырастаў у людзкую нянавісьць,
яго песьлі начамі ў лясы і бары,
і чакалі хвіліны праўдзівай расправы,
і тачылі аб камень свае тапары.

Праз балоты ішлі да чырвонага стягу,
гартавалі ўпартасьць, як полымя — сталь
і чакалі, што час вызваленьня настане,
і пагодлівы дзень пяўзабаве настаў.

Ад самае ночы грымелі гарматы,
стагнала зямля, палящелі палі,
жывыя і трупы валіліся радам
пагінулі сотні — мільёны прайшлі.

Праз гэты агонь павальніцы нялюдзкай
адзіная мэта працоўных вяла —
узьняць над краінай штандар рэвалюцыі,
каб вольнаю праца людзкая была.

Вось так, па крывавых шляхох і дарогах, па
вуліцах спаленых, зьбітых нашчэнт, чырвоная армія сьцяг перамогі прынесла, як сонца,
у зруйнованы Менск.

Краіна спраўляла сваё вызваленьне,
агні залівалі ваду і зямлю, героям, што
згінулі ў бойках праменных байцы аддавалі апошні салют:

Таварышы нашы, браты і сябры, нехай
вам сьпяваюць бары і вятры вялікую
песьню людзкіх перамог —
вы мужна загінулі ў слаўных баёх.
Клянёмся-ж над вашаю трупою ваяк
узьняць над сусьветам камуны маяк.

— Наперад-жа, хлопцы! —
сказаў камандзір, —
Нас партыя кліча на фронт будаўніцтва,
дык выйдзем-жа дружна, усе, як адзін,
як дружна ішлі ад пашоў бараніцца.

Я веру, што нас ні маланка, ні гром
Ня скрышыць ні ў якіх завалах.
Вярэце-ж цьвярдзейшы, таварышы, крок
бадзёрую песьню давай, запявала.

ПЕСЬНЯ

Мы агнём і мячом здабываем яе —
маладую рэспубліку працы,
аддавалі красу і жыцьцё за яе —
маладую рэспубліку працы.

На руінах яна пачынае свой дзень —
маладая рэспубліка працы,
Да камуны шляхі непакорна вядзе
маладая рэспубліка працы.

І калі зноў ахопяць навалы агні
маладую рэспубліку працы,
як адзін, мы паўстанем яе бараніць
маладую рэспубліку працы.

Дапаможа народы з няволі падняць
маладая рэспубліка працы,
і на сьвеце шырокім паўстане адна
маладая рэспубліка працы.

Крывавыя старонкі

(З ГІСТОРЫІ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫЗВАЛЕНЬНЕ БЕЛАРУСІ АД АКУПАНТАЎ *)

У 13-ую гадавіну сьвяткаваньня юбілею вызваленьня Беларусі ад акупацыі хочацца пакапацца ў архіўных матар'ялах і асьвяжыць у памяці падзеі гэтага перыяду. Дамо слова фактам, якія не патрабуюць каментарыяў, бо яны красамоўна гавораць самі за сябе.

Менск быў занят белапалякамі 8-га жніўня 1919 г. Як толькі польскія акупанты ўвайшлі ў горад, яны растралялі каля двух дзесяткаў асобін явнаватых людзей, трупы якіх валяліся то тут, то там. Пайшлі нагалоўныя рабункі, падпалы і пажары. Грабілі і падпальвалі ўстановы, фабрыкі і заводы. Тады зноў пачыналася абліваньне упаўшага халоднай вадой.

— Мне, — заяўляе тав. Салер,— пры допыце сьціскваллі дзьвярыма пальцы, шампалямі спаласавалі ўсё цела і раны пасыпалі солью.

— Камуніста Кавальскага, — піша т. Айсн-Загарчык, па даносу правакатара Шамонскага польскія жандары аграбілі, кінулі ў турму, дзе яго атруцілі (па другой версіі — задушылі).

У нас мацца вялікая колькасьць фактаў, накшталт вышэй азначаных, але для прыкладу мною прыведзены колькі некаторыя з іх.



Зруйнаваная акупантамі вёска і

ды, грабілі прыватных асоб і гандлёвыя магазыны. На многіх вуліцах, з кватэр, дзе адбываліся гвалты і рабункі, раздаваліся распачлівыя крыкі: «Ратуйце, гвалтуюць, забіваюць»» і г. д. Жанчын згвалтоўвалі і секлі. Яўрэям стрыглі бароды, вырэзвалі валасы разам са скурай. Сталі шукаць бальшавікоў. Шукалі бальшавіка «Хаімаа», таму арыштам падвергліся ўсе Хаімы г. Менску (іх было больш сотні).

Турмы і арыштныя дамы былі перапоўнены працоўным людам гораду і вёскі. Капітан польскай дэфэнзывы пан Красуцкі і яго агенты лютавалі ва ўсю. Пан уласнаручна зьбіваў арыштаваных гумавай нагайкай. Цэлымі часамі мучылі няпчасных, якім на брытыя галовы каплямі лілі халодную ваду. Каталі да страты прытомнасьці, загналі іголкі пад ногці, працягвалі над мышкі вузкія скураныя рамні і падвешвалі да столі. Прымушалі пакутнікаў есьці прыгоршнямі сырую муку, а тым, хто адмаўляўся, ўсыпалі «двадзесьце пенць».

— Лопайце, лопайце, пся крэў, бальшавікі, — камандавалі каты — і ледзь жывыя, скалечаныя людзі глыталі муку, кідаючы з-пад цішка на інквізытараў палаючы нянавісьцю зрокі. Такія сцэны паўтараліся на працягу раду дзён. Некаторыя пакутнікі ня вытрымлівалі, вар'яцелі, а іншыя скончалі жыцьцё самагубствам.

— Калі ўспамінаеш пра зьдзекі панаў з нас—зьдзіўляешся, як гэта мы засталіся жывы, — піша тав. Глебовіч.

— Мяне, — піша тав. Маслыкоў, — людзі-зьверы некалькі разоў жудасна зьбівалі і мучылі, зьбівалі і мучылі да паўсьмерці, да страты прытомнасьці. Тое самае зрабілі белабандыты і з маім бацькам і з братамі. Брата майго, партызана Івана, пасьля доўгіх, нячуваных катаваньняў растралялі, а мяне асудзілі на дзесяць год катаргі.

— Дапытваемым у дэфэнзыве, — піша тав. Тан, — зьвязвалі рукі і ногі вяроўкамі і калясам круцілі на працягнутай паміж лакцямі рук і нагамі пальцы, прычым рамнямі білі па пятках да «зьяцьця падмётак» (жаргон жандармэрыі), — г. зн. да страты прытомнасьці.

— Дзьве гадзіны, — гаворыць аўтар, — працягвалася кашмарнае зьбіеньне і катаваньне, потым, аблліваючы ахвяру халодной вадой, пусьцілі ў ход так званы (на жаргоне жандармэрыі) «маятнік», прычым практыкаваўся такі мэтад: дапытуемага ставілі насярэдзіне пакою і два дужыя жандары, стоячы з абодвух бакоў, напосілі ахвяры вялізнымі кулачышчамі моцныя ўдары, аж пакуль яна ня хісталася «маятнікам» і не валілася снопам на падлогу. Тады зноў пачыналася абліваньне упаўшага халоднай вадой.

— Мне, — заяўляе тав. Салер,— пры допыце сьціскваллі дзьвярыма пальцы, шампалямі спаласавалі ўсё цела і раны пасыпалі солью.

— Камуніста Кавальскага, — піша т. Айсн-Загарчык, па даносу правакатара Шамонскага польскія жандары аграбілі, кінулі ў турму, дзе яго атруцілі (па другой версіі — задушылі).

У нас мацца вялікая колькасьць фактаў, накшталт вышэй азначаных, але для прыкладу мною прыведзены колькі некаторыя з іх.

Пры заняцьці Менску белапалякамі з прычыны іх крывавага тэрору грамадзкае жыцьцё ў горадзе амаль зусім замерла; рабочыя клюбы пазакрываліся, сходы спыніліся, дзейнасьць прафсаюзаў ліквідавалася. Эксплёатацыя рабочых значна ўзмацнілася; яны былі пазбаўлены ўсіх правоў і ільгот, якія ім дала Кастрычніцкая рэвалюцыя. Працоўныя апынуліся пад цяжкім уціскам акупантаў, — гэтых «освободителей» Беларусі. Замест гэтага расьцьвіталі шыкарныя рэстараны, кафэ-шантаны дзеля пацехі панскай і буржуазнай публікі. Контр-рэвалюцыя сьвяткавала сваю перамогу над пралетарыятам.

Аднак, нядоўга працягвалася такое становішча. Прайшоў некаторы час і прыдушаны рэвалюцыйны рух зноў падняўся. Злачынствы і гвалты сталі выклікаць страшэннае абурэньне і глыбокую нянавісьць да акупантаў ня толькі з боку шырокіх народных мас, але нават сярод пэўных буржуазных, асабліва дробна - буржуазных колаў, якія спачатку чакалі паноў, як «ратаўнікоў» ад бальшавіцкіх і якія потым расчараваліся ў сваіх надзеях.



Разбураны ў часе акупацыі мост праз р. Бярэзіну

Усе з жудасьцю і брыдотай адвярнуліся ад прытэнтацелаў. Людзі былі пракляты адзіным пачуцьцём, адзіным жаданьнем, адной заваеднай думкай — як мага хутчэй выгнаць белапалякаў з межаў Беларусі і зрабіць так, каб іх духу тут не засталося. Пад кіраўніцтвам камуністаў, што засталіся ў Беларусі, былі створаны падпольныя рабочыя арганізацыі і партызанскія паўстанцкія атрады, да якіх далучыліся рэшта настроеныя супроць савецкай улады дэзэртыры з Чырвонай армії. Гэтымі падпольнымі арганізацыямі ў горадзе і на вёсцы была разгорнута вялікая работа і яны сваёй самаадданай і гераічнай барацьбой супроць акупантаў уносілі дэзарганізацыю ў тыл польскай армії. Зразумела, што белапалякі жорстка і бязьлітасна распраўляліся з падпольшчыкамі і паўстанцамі, агнём і мячом руйнуючы і зьнішчаючы дзесяткі вёсак, пасадаў і г. д. Аднак, гэта не спалохала змагароў за савецкую ўладу і яны энэргічна працягвалі барацьбу з сваім сьмяротным ворагам.

Партыйная работа ў Менску праводзілася шляхам наладжваньня нелегальных рабочых сходаў. На гэтых сходах пашыралася бальшавіцкая літаратура, часопіс «Факел революции», пракламацыі, лістоўкі і г. д. Праз некаторы час польская ўлада стала даваць дазволы на «легальныя» рабочыя сходы, але гэта было зроблена з чыста правакацыйнай мэтай і напаміна «стары добры час» славутай «зубатаўшчыны», бо на сходах прысутнічалі таемныя агенты дэфэнзывы, у выніку чаго многія камуністы былі пасьля арыштаваны. Гэтаму да пэўнай ступені садзейнічала, з аднаго боку, надта наіўная і непатрэбная «адкрытасьць» некаторых таварышоў, выступаўшых на «легальных» рабочых сходах, з другога боку, правакацыйныя выбрыкі меншавікоў, бундаўцаў і паалей-сыяністаў, якія неаднаразова на «легальных» сходах, бывала, кажуць прамоўцам - камуністам (выступаўшым, як «прафэсыяналісты»): «Скідайце вашы маскі і адкрыйце ваш сапраўдны твар». Адзін з прадпіўнікаў камуністаў, член ЦП прафсаюзаў, у сваім выступленьні заявіў, што «за камуністамі ідуць несьвядомыя элемэнты, — як прачкі, хатнія работніцы і г. д.».

Але, ня гледзячы на ўсе вылазкі варожых камунізму элемэнтаў, большасьць прафсаюзаў г. Менску (саюзы швэйнікаў, мэталістаў, будаўнікоў і інш.) цалкам знаходзілася пад уплывам кампартыі, якая карысталася поўным давер'ем шырокіх працоўных мас. Ва ўсіх буйных прафсаюзах на выбарах у гарадзкое самакіраўніцтва праходзілі камуністычны сьпіс № 1. Камуністы прадстаўлялі сабой моцную арганізацыю, з якой прыходзілася лічыцца.

Камсамольцы працавалі самаадданна і вельмі энэргічна. Яны прымалі самы актыўны ўдзел у падпольнай рабоце партыі, у рабочых сходах («легальных» і нелегальных), у прафсаюзнай дзейнасьці, у выбарах праўленьня саюзу служачых у ЦРК, у барацьбе супроць бюдаўцаў і паалей-сыяністаў, у пашырэньні камуністычнай літаратуры і г. д. Ня было такога рызыкальнага кроку, ня было такой небясьпечнай справы, ня было такога гераічнага ўчынку, перад якімі камсамольцы спыніліся-б.

Падпольныя друкарні, якія знаходзіліся на ваколіцах гораду, выпускалі розныя пракламацыі, адозвы, лістоўкі і г. д. Часта з прычыны шпіянажу прыходзілася пераводзіць друкарскія машыны, шрыфты і г. д. з аднаго месца на другое. Гэта работа была выканана таварышамі-друкарамі найлепшым чынам.

Многа бяды прычынілі менскай падпольнай арганізацыі здраднікі і правакатары — Плоткін Коля — Онбрэйн — Эпштэйн, Шамонскі, Міша Шальмук, Розэнштэйн, Пірштоун, Жук, Нядведзкі, якія аддалі ў рукі польскай жандармэрыі і дэфэнзывы шмат таварышоў.

Аб страшэнных выніках гэтых правакацый, аб правалах, арыштах, катаваньнях, забойствах і растрэлах гавораць нам дзесяткі аўтараў гэтых успамінаў. Актыўны падпольны работнік у часе акупацыі белапалякаў — тав. Айсн-Загорчык дае нам яркі малюнак таго, што рабілася ў турме, характарыстыку турэмшчыкаў — «сацыялістаў», пэпэсаўцаў, сьледчага паалей-сыяніста Гэльтмана і іншых.

Як толькі з Менску выналі паноў і ўвайшлі чырвонаармейцы, многія ад радасьці цалавалі ім рукі і ногі, а жанчыны з чырвонымі хусткамі, прывязанымі на палках, крычалі: Няхай жыве Чырвоная армія! Няхай жыве савецкая ўлада!

Д. РОЗЭНБЛЮМ.

*) Уцята з матар'ялаў, маючыхся ў архіве Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б. Дасьцца ў перапрацаваным і скарочаным выглядзе пры поўным і дакладным захаваньні зьместу рукапісаў.

Зробім усе калгасы бальшавіцкімі, а калгасьнікаў заможнымі!

ЗА ПЕРШАЧАРГОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ

Становімся заможнымі

Ліст калгасьнікаў латыскага нацыянальнага калгасу „Сараканайс Арайс", Глускага раёну

Гераізм латышскіх спраўнікоў упісаў вая сяўба і праполка забясьпечылі нам высокі ўраджай. 10 цэнтнэраў збожжавых і 130 цэнтнэраў бульбы з гектару — мяркуем мы сабраць сёлета.

Пасьля выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай, засыпкі насенных, страхавых і фуражных фондаў у нас па прыбліжных падліках на адзін працадзень прыпадае 3 кілё збожжавых культур і 16 кілё бульбы. Атрымаць такую колькасьць прадукцыі на адзін працадзень, гэта значыць стаць заможным.

ПАЗАРЫН ЯН да ўступленьня ў калгас быў бедняком. Сёлета ён атрымае каля 18 цэнтнэраў (108 пудоў) збожжа і 96 цэнтнэраў (600 пудоў) бульбы на тры душы сям'і.

ГАЛАМАКА АНДРОН—батрак адзіночка атрымлівае за свае працадні 7,5 цэнтнэраў збожжа і 40 цэнтнэраў бульбы. Сераднік да калгасу **ЮХНЕВІЧ ІНДРЫК** за свае працадні атрымлівае 12 цэнтнэраў збожжа і 64 цэнтнэры бульбы.

Усё гэта яскрава сьцьвярджае, што і бедняк і сераднік, і батрак, стаўшы на калгасны шлях прыходзяць да заможнага жыцьця.

Але ў гэтым яшчэ ня ўсё. Мы расьцем і культурна. Калі да Кастрычніка ў нас 50 проц. насельніцтва было няпісьменным, то зараз за выключэньнем трох старыкоў усе пісьменныя. Наша школа—наш гонар. Яна пабудована ў 1925 годзе і працуе на нашай роднай латыскай мове. Школа выхоўвае маладое пакаленьне ў бальшавіцкім напрамку. Ёсьць у нас хата-чытальня і бібліятэка на латыскай мове. На кожную хату выпісваюцца два экземпляры газэты.

Працай калгасу кіруе кандыдацкая група КП(б)Б, якая мае двух членаў партыі і трох кандыдатаў.

У розультаце ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі мы становімся ў перадавыя рады змагароў за сацыялізм.

Зараз надыходзіць уборка і разам з ёю—здача прадукцыі дзяржаве. Шырока абгаварыўшы гэта пытаньне мы рашылі ўборку сена закончыць не пазьней як 20 ліпеня, уборку ўсіх збожжавых культур не пазьней 25 жніўня. Адразу прыступаем да малаць бы. З першага снапа мы здаем дзяржаве тую прадукцыю якая належыць з нашага калгасу. З другога снапа мы засыпаем усе ўнутрыкалгасныя фонды і пасьля гэтага астачу будзем разьмяркоўваць па працаднёх.

Намі кіруе слаўная бальшавіцкая партыя, на чале якой стаіць правадыр сусьветнага пралетарыяту тав. Сталін. Гэта надае нам сілы і ўпэўненасьці ў нашай перамозе.

Тады і цяпер

Хто з нас ня помніць лёсу прыгарадпай або местачковай беднаты, асабліва беднаты двойчы прыгнечаных паліцэйскім ботам нацменшасьцяй. Усякія абмежаваньні, жабрацтва, галеча, нечалавечыя зьдзекі і адсутнасьць якіх-бы там ні было надзей на паляпшэньне,—вось чым зьяўлялася жыцьцё гэтай беднаты.

У свой час усё гэта мы адчулі на сабе. Мы выхадцы з брудных «акраін», з хібарак прыгарадаў, з сялянскіх гаспадарак без зямлі. Сярод нас—беларусы, яўрэі, палякі, велікарусы, немцы, аўстрыйцы. Мы прышлі адтуль, дзе нас моцна, як смоўж, трымала ў сваіх прятных лапах беспрасьветная бяда. І толькі савецкая ўлада дала нам магчымасьць свабодна, сваімі рукамі будаваць сваё жыцьцё, стаць цьвёрда на зямлю яе паўнапраўнымі гаспадарамі.

На аснове калектыўнай працы мы з году ў год паляпшаем сваё становішча. Калі ў 1930 годзе кожны з нас на адзін працадзень атрымаў 2 р. 47 к., а ў наступным—3 р. 67 кап., то ў мінулым годзе гэта лічба ўзрасла да 11 рублёў.

А хіба мы змаглі-б дабіцца такіх рэзультатаў ад сваёй работы, калі-б у нашай краіне з посьпехам не ажыцьцяўлялася ленінская нацыянальная палітыка, калі-б нам не кіравала ленінская партыя, наш **СТАЛІН**, калі-б нам не дапамагала наша родная Савецкая Улада.

Вось чаму нам так добра зразумелы словы тав. Сталіна — зрабіць калгасы бальшавіцкімі, а ўсіх калгасьнікаў заможнымі.

Тыя 11 рублёў, якія мы атрымалі ў мінулым годзе на адзін працадзень, зьявіліся ў розультаце таго, што наша праца ў пяршыню была па-бальшавіцку арганізавана, што мы пазбавіліся ўраўніляў, што мы паставілі крыж на абязьлічцы, што мы рашуча ачышчаемся ад кулакоў і спэкулянтаў, якія пралезьлі ў нашы рады, каб перашкаджаць нам будаваць бальшавіцкі калгас.

Аднак па гэтым мы ня спыніліся.

Веснавыя работы сустрэлі ў поўнай гатоўнасьці: коні як лялькі, зіхацела збруя, у добрым стане была кожная машына, кожная прылада. Правільна расстаўлена і арганізавана рабочая сіла.

Гэта дало нам магчымасьць веснавую сяўбу бягучага году ў параўнаньні з мінулым годам закончыць на 11 дзён раней, значна зьнізіўшы пляновыя меркаваньні па затраце працадзён.

Як-жа мы працуем зараз?

Раскажам аб гэтым на прыкладзе праполачных работ. У аснову праполкі, як і кожнай іншай работы, мы кладзем пляновасьць, улік, сацыялістычнае спаборніцтва. Праполку, якая ў нашай агародняй гаспадарцы адыгрывае выключна-важную ролю, мы сустрэлі маючы падрыхтаваны і добра адрамантаваны інвэнтар, ясьлі, правільную расстаноўку сіл, дакладны плян летня-асеньніх работ.

Жанчыны кожнай брыгады разьбіты на зьвеньні па 5-10 асоб. Кожнае зьвяно мае свайго зьвеньнявога арганізатара і пэўны вучастак пасеву, за чыста ту якога зьвяно адказвае. Кожны брыгадзір і зьвеньнявы арганізатар ужо загадзя ведае, што ў такі-та час трэба будзе праводзіць, скажам, прарэджваньне гуркоў і што іменна гэту работу трэба выканаць за 7 дзён, на плошчы 15 га, пры норме—0,5 га на чалавека, што на гэту работу патрэбна 30 чалавека-дзён наогул, што пры выкананьні нормы налічваецца 2 працадні, а за ўсё прарэджваньне 30 працадзён. І такі дакладны разьлік на кожны вытворчы працэс.

Мы ўжо скончылі першую праполку каласовых і гародніх культур. Пачалі другую праполку, якая да II-га ўсебеларускага зьезду скончана, прычым пры першым і другім поліве мы ў міжрадзьдзях успушхняем зямлю рунным «плянэтам». Прыдзем на поле, на город і ў вочы адразу кідаецца пульхнасьць зямлі і адсутнасьць зельля. Ужо ўзараны і набараванны папар. У поўным разгары касьба сенажаці першага ўкосу канюшыны. Да 15 ліпеня і гэта работа будзе скончана.

Так мы працуем.

Пасылаючы на зьезд свайго дэлегата, наш агульны сход даў яму наказ:

— Скажы там ад нашага імя дэлегатам і госьцям зьезду, скажы прадстаўніком бальшавіцкага ЦК і ўраду, што мы, калгасьнікі інтэрнацыянальнай арцелі «ЧЫРВОНЫ БЕРАГ», пад кіраўніцтвам палітадзелу і сваёй партыйнай ячэйкі тэмпаў не здамо, што мы ў адзнаку сьвята вызваленьня і 2-га ўсебеларускага зьезду ўдарнікаў сацыялістычных палёў—

— ня менш, як тры разы праполем гародніну і столькі-ж раз правядзем акуўваньне бульбы;

— што мы ўжо адрамантавалі склады для ўраджаю, падрыхтавалі, напыр скалі растворам вапны хавальнікі гародніны, чаны на квасільным пункце, падрыхтавалі коняй, інвэнтар і машыны для ўборкі, забясьпечылі іх запаснымі часткамі;

— што намі падабраны і вылучаны зьвеньні спэцыялістаў па выбарцы гуркоў, па іх засолцы, па ачыстцы коранплодаў, секараў капусты, возчыкаў, чысьцільшчыкаў, шаткавальшчыкаў і квасільшчыкаў;

— што для аховы ўраджаю вылучаны выпрабаваныя пяць вартаўнікоў, з якіх адзін аб'езчык. Кожны вартаўнік адказвае за пэўны вучастак пасеву аж да канца ўборкі. Апрача таго з ліку членаў праўленьня вылучан калгасьнік, які правярае работу вартаўнікоў.

— Мы бярэм на сябе абавязак на сваіх 28 га жыта правесьці ўборку ў 10 дзён і з першага-ж абмалоту **ЗДАМО ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ.** Астатнія збожжавыя ўбраць за 8 дзён і закончыць здачу. 15-га верасьня здаць дзяржаве 100 тон гуркоў, 15 тон буракоў, 10 т. бручкі і ў кастрычніку—бульбу і 200 тон капусты.

— Ужо на сёнешні дзень мы звышпляну па цьвёрдых цэнах прадалі дзяржаве каля 3-х тон парніковых гуркоў і 50 цэнтн. зялёнай цыбулі, здача працягваецца.

Выкананьне ўсіх гэтых абавязкаў перад сваёй роднай дзяржавай зьяўляецца для нас, як і ўся наша праца, справай гонару і славы. У сацыялістычным спаборніцтве з Вяземскай МТС, пад кіраўніцтвам палітадзелу і сваёй партыйнай арганізацыі, рашуча ачышчаючы свой калгас ад клясава-варожай засьмечанасьці, мы ўпэўнена пойдзем да новых перамог.

Калгасьнікі інтэрнацыянальнай с.-г. арцелі — **«ЧЫРВОНЫ БЕРАГ»**, Аршанскага раёну:

Старшыня калгасу **А. МІРОНЧЫК.** Ударнікі — **КАЗІНЕЦ, ВАЙНЭР, КУЛАКОЎСКІ, ТАЎГЕР Х., ТАЎГЕР Е., САПЕГА, СОБІН, ГЕРМАН, ЛОГІНАВА, ТАЎГЕР Н., МАЛАЖАЕВА К., ТАЎГЕР Р., САКОВІЧ В., ВАРЫВОНАВА.**

Kemmerfeld, A. Bradd, F. Воркин, Ритов Е.М.

ПЛАТОН ГАЛАВАЧ

З тых дзён

— Хто-ж пойдзе?

Мужчына, бы ло яму год трыццаць пяць, падняўся за сталом, абапёрся на яго абедзьвюма рукамі і чакаў, пакуль хто з прысутных абсавецца на ягонае пытаньне.

На стале перад ім стаяла напалову пустая бутэлька і, як і перад іншымі, чарка з нявыпітай гарэлкай і закуска. За хатай ашалела кружыўся восеньскі вецер, сьвістаў у частакол і зашыўся пад зачыненыя вакіцы, ірваў іх ад сьцяны і бразгаў жалезнымі зашчапкамі. Са страхі раўчуком цэлым сьцякала вада і бесьперастанку плюхала.

— Дождж добры, — сказаў мужчына, недачакаўшыся адказу на сваё пытаньне. — Час ісьці. А дванаццатай трэба быць на месцы. Ну, хто-ж ідзе са мной?

— Я пайду.

Той, хто даў згоду ісьці, узяў са стала чарку і набком выпіў усю гарэлку. А пачырванеўшы, стала яму трохі ніжмка, сказаў, каб запраўдацца:

— А то стаіць дарэмна на стале, ніко вочы мазоліць.

Ён, як сказаў гэта, усьміхнуўся і зірнуў на сяброў.

— Хадзем, — сказаў першы і выйшаў з-за стала на хату.

Пра кніжку ўсе яны былі на дварэ. Тыя, што згаварыліся разам ісьці, сталіся за брамай і чакалі, а трое паміж адразу ў вуліцу, павярнулі ў лезы канец яе і хутка зьнікні. Калі нельга было пачуць, ужо і іншых кроках, пашлі і гэтыя.

Дождж не сьціхаўся. На вуліцы было цёмна, хоць выкалі вока. Хаты хаваліся за частаколамі, за зашчытымі вакіцамі, — так было дзьвярыма і вакіцамі, — так было спакайней, ніхто ня ўбачыць хоць, хто ёсьць у хаце, што там робіцца. І толькі па таму, як скрозь шчыліны ў вакіцах шыпяся на вуліцу з хаты сьвятло, можна было дагадацца, што хаты блізка.

Тыя, што ішлі цяпер па вуліцы, былі рознымі па ўзросту і па прафэсіі. Аднаму з іх было год трыццаць пяць, а другому толькі дваццаць чы. Адзін, старэйшы, працаваў у рамонтных чыгуначных майстэрнях, другі быў тэлеграфістам. Дарогі пад нагамі ў сябе яны ня бачылі, а наўтад ступалі ў гразь і ботамі намацвалі пад гразьвю брукаваную вуліцу.

— Ён адзін будзе?

Гэта пытаў маладзейшы

— Адзін.

— Хаця-ж бы ўдалося.

— Піш-ш...

Насустрач ехаў вайсковец. Калі ён наблізіўся, старэйшы, абдымаючы спадарожніка за плячо, весяла і голасна, каб пачуў вайсковец, сказаў:

— Бра-а-т ты мой, дык гэта-ж дзяўчына! Ягадка...

— Бач, чэрці п'яныя.

Вайсковец схіліўся ў іншы бок, нічога ня ўбачыў і пагнаў каня рысьсю.

— Нам трэба зьвярнуць з дарогі.

Асьцярожна памацаўшы зямлю, пераступлілі вузкую канаўку і пашлі ўправа.

— Ну і ночка!

— Нам шанцуе, — сказаў старэйшы.

— Гэта добра, што цёмна.

Адразу за гарадзкі ўскраіны мясцовасьць падымаецца цэлаю групай узгоркаў. Некаторыя ў бок гораду, яны канчаюцца абрывамі, правальваюцца ў густую цемру ночы. Хадзіць тут у такую ноч небясьпечна. У лепшым выпадку можна сарвацца і заляцкацца ў гразь, а то можна ўпасьці ў яму, напалі іх тут дастаючы глыбіну, і скалечыцца. І старэйшы падіху рэйць:

— Ідзі за мною і як можна цішэй і асьцярожней!

— Добра.

Абодвы ізмы рады і дажджу і такой, на нявычайнаму, цёмнай ночы. Паралелі пацёку прасоўваецца, узбраючыся ў чорную шырань зямлі пад нагамі і шчупае перад сабою цемру кійком, а тады ўжо, усьлед за кійком, перастаўляе ногі. За ім, як цень, каб не застацца ні на адзін крок, ідзе малады тэлеграфіст. Пад нагамі то мокры густы пясок, то клейкая гліна. Ногі ў гліне грузнуць і коўзаюцца па зямлі.

— Тут трымайся рукамі і лазь. Яма.

Пярэдні дзесьці зьнік у нізе. А калі ягоны спадарожнік яўдала абсунуўся па мокрай гліне ўніз і стаў з запэцканымі рукамі, мяркуючы, што з імі зрабіць, старэйшы стаяў, сагнуўшыся над лужынкай, і мыў рукі.

Цяпер дарога будзе добрая скрозь, аж да кустоў, — сказаў ён, як выпрастаўся. — Там і будзем чакаць.

Зноў пайшлі. Хутка зьмецілі напярэдзе зьлева цьмяны агеньчык ліхтара. Адзінцом на ўвесь прастор загарадная ночы вісеў ліхтар на слупу і ад ветру паволі калыхаўся, расьсьвячы і без таго цьмянае сваё сьвятло. Як падыйшлі яшчэ бліжэй, можна было бачыць самы верх слупа, на якім вісеў ліхтар, і, калі-б прыгледзецца ўважлівей, кавалак каменнай сьцяны нейкай вялікай будыніны.

Як параўняліся з ліхтаром, сталі каля куста на сухім і прыслухаліся. Але з таго боку, дзе будыніна, аніводнага гуку. Толькі вецер дзесьці час ад часу працягла засьвішча, а тады зноў паўзе па над лугам ягоны ніроўны, хвалісты гул. Вецер ня дуе, ірве і дзівіцца можна, як не парэзганяў ён нізкіх хмар. І чым мацней вецер, чым спарней дождж. Ад дажджу і ветру наўкола ў кустох гул і калі пайсьці цяпер, ніхто не пачуе чалавечых крокаў, нават зблізку.

— Хадзем!

Старэйшы крануў свайго спадарожніка за рукаў.

— Гэта-ж ты ўвесь мокры.

— Дзіва якое, такі дождж.

Пайшлі і спыніліся за кустом, зусім непадалёк ад дарогі.

— Піш-ш... аніводнага гуку.

***

Разбудзілі пасьля таго, як доўга кусьлі за плечы. Апошнія дзьве ночы зусім ня спаў, а сёньня з вечару як лёг, так і заснуў адразу, зусім лёгка. І ў сьне нешта цікавае бачыў, такое, чаго зусім не хацелася пакідаць сьніць.

На дварэ са сну было холадна і ён сьпяшаючыся запяклінуў падзеўку на ўсе гузікі. На дварэ пазяхнуў, вельмі-ж хацелася спаць яшчэ, а пасьля, як пачраніў нагой у лужыну, зірнуў на стаптаныя свае гамашы, пад ліхтаром яны відаць былі, і вазраніў штанину, што была падкасалася, як спаў.

Не дварэ, непадалёк ад слупа стаяла хурманка, доўгія і шырокія плоскія калёсы. Такія Ігнат бачыў на горадзе. На іх вазілі піва. Наўкола пяць чалавек. Чацьвёра з іх з мінтоўкамі. Той, што бяз мінтоўкі, загадаў садзіцца.

— Куды паязеце? У такую пару я нікуды не паеду. Я пратэстую. Я патрабую суда.

— Суд будзе, а пакуль мне загадана вазьці цябе і я павязу. Пскраў! Большэвіце падло...

Начальнік канвою яшчэ раз загадаў садзіцца. Спрачацца было бескарысным і Ігнат сеў. За плячыма ў яго, з другога боку калёс, сядзела двое салдат. Двое селі побач з ім, на абое бакі. Зваду сеў начальнік канвою і загадаў пагнянтаму ехаць.

Адчынілася брама. У двор хлынула з дарогі насустрач хурманцы густая ноч і конь прапаў у ёй. Дзесьці напярэдзе плюхаў па лужынах конь, а катні каціліся роўна і шурпеў пад каткамі вільготны пясок. Каб сагрэцца, Ігнат настаўф каўнер. Як сагрэўся, пачаў здагадвацца, куды яго вязуць і спалохаўся нечаканай адгадкі. Ад таго, што было гэта нечаканым і неабмеркаваным, зрабілася надобра, нешта стала камяком у горле і каб зноўку спакойна дыхаць, ён колькі разоў пракаўтнуў сьліну.

Пасьля гэтага-ж нечакана прышла другая думка.

«Ногі зусім ніжка над зямлёй. Калі-б з усіх сілы кінуцца з возу, можна ўцячы. Каб толькі не пасьпелі парнуць штыком».

Наўкола густая цемра. З абодвух бакоў салдаты.

«Падзеўка толькі цяжкая, каб ня ў рукавы апрануў...»

І ён напружметна расплікае гузікі, хоць яшчэ ня прыняў канчатковага рашэньня, уцякаць ці не. Рука ад хваляваньня дрыжыць і гузікі ня слухаюцца пальцаў.

«Абы саскочыць з калёс і прабегці крокаў пятнаццаць-дваццаць. Тады на ходу скіну падзеўку і ўсё. Цёмначы не пападуць. Уцяку».

З боку, так пачулася Ігнату, плюхнула вада, ня ўсі хто ідзе непадалёк побач з дарогай. Ён слухае, але больш нічога ня чуе, акрамя дажджу ды конскіх крокаў. Едзе хурманка паціху і час цягнецца да балючасьці доўга. У галаве мысьлі зьмяняюцца чарадой, кружацца наўкола адной, бляцюцца, перашкаджаюць думаць. Побач з дарогай перад самымі вачыма чарнеюць кусты. І за кустамі зноў плёхнула вада, нібы нехта ступіў нагой у лужыну. І зноў нічога.

«Тут — сам[illegible] — ідзе месца. Два кроні і кусты. Трэба хутчэй».

Да галавы густа прыліла кроў, на мо мант галава закружылася і праз меру часта забілася сэрца. Каб у гэты момант кінуцца з калёс, хутка ўпаў-бы.

«Ну, што-ж я, так нельга. Зараз-жа! Ці так, ці так прападаць».

Салдат, што сядзеў зьлева, раз-пораз пазяхаў і абедзьвюма рукамі трымаўся за мінтоўку, якая стаяла ў яго паміж ног. Другі, што з правага боку, трымае адну сваю руку на яго падзеўцы.

«Ці так, ці так...»

— А-а-х...

Ігнат з усёй сілай разгарнуў локці і абоімі ўдарыў з усяго размаху ў грудзі салдатам і крыкнуўшы ад страху і каб падбадзёрыць сябе, скокнуў з хурманкі, з разгону пераскочыў цераз канаву, зьмеціў яе тады, як стаў на самы край яе, зачапіўся рукою за куст і тады, прыпомніўшы, хуценька вызваліў з рукавоў падзеўкі свае рукі.

— Пскраў...

Мільтанулі агні і грымнулі два прыглушаныя стрэлы і сьледам-жа яшчэ некалькі стрэлаў ззаду. Стрэлы малаклай надарвалі цемру ночы, ляснулі на яе прыглушанай цішыні і адкінулі Ігната далей у чорную бездань, насустрач густой, ліпкай цемры. Ён ня слухаў, што робіцца з-за ду.

— Гах, гах, гах, гах... Гэта ён сам дыша так цяжка і з усяе сілы станоміць на мокрую зямлю стомленыя, хісткія ногі. Калі-ж прыслухаўся да сваіх крокаў, пачуў, што сьледам за ім бяжыць яшчэ нехта. І яшчэ пачуліся стрэлы.

«Даганяюць. Каб хоць колькі крокаў яшчэ».

Ён зьбірае апошнія сілы, кідаецца наперад, але на ізбе выступае халодны пот, пад самае горла падступіла ташнота і зноў, як было на момант на хурманцы, нельга дыхаць. Ён каўтае сьліну, але ташнота не праходзіць, а падгортваецца яшчэ бліжэй да горла і зусім блізка ўжо кроні тых, што даганяюць.

«Даганяюць. Лепш стаць, можа прамінуць».

Але як стаў, галава закружылася і, хапаючыся перад сабой рукамі за паветра, ён з усяго разгону прыпаўся грудзямі вобзем.

«А-а-х. Прапала».

Двое, як паваліўся Ігнат, адразу падхапілі яго пад рукі, падняялі і падбежкам пацягнулі яго, наўгад накіроўваючы свой крок у бок да гораду.

Іншы доўга. На момант спыналіся, каб жачэй узяць гаю, каго несьлі, і зноў ішлі і ў ходзе не заўважылі, што чалавек, якога яны вялі пад рукі, апамятаўся і яшчэ нічога не разумеючы, сьпяшаецца сам перабіраць нагамі. Зусім ён апамятаўся тады, калі на станцыі яго падсадзілі ў таварны вагон і за плечы адцягнулі ў глыб вагону. Моцна забалела плячо і ён, прыпомніўшы ўсё, што было, спалохана ўскрыкнуў і застагнаў. Інстынктыўна, як сядзеў, адкінуўся яшчэ далей у глыб вагону.

— Ігнат! Таварыш Ігнат...

Нейкі час маўчалі. Ігнат сьвідраваў вачыма цемру, каб хоць зьмеціць постаці людзей, а потым выставіў у цемру перад сабою руді, каб знайсьці іх.

— Я... са сваімі? Жывы? Хто вы?— Рукою намацаў палу чыйгось паліто.

— Хто тут?

— Стась, тэлеграфіст, калі памятаеш, — і я, рыжавусы з рамонту.

— Таварыш Кудзіш? Братка! Як-жа гэта? Хлопцы...

Ён паціху падняўся на ногі, падаўся наперад і ў поцемках знайшоўшы таварышоў, абняў іх.

— Мяне, здаецца, у плячо паранілі. Нейкая шалёная куля патрапіла-ж акурат.

Ён, гаворачы, рукою памацаў сваё плячо.

— Такі патрапіла, кроў яшчэ ідзе.

— Агня вось няма. Але мы так. Ты пакажы, дзе гета.

Кудзіш асьцярожна, сьледам за Ігнатавай рукой, памацаў рану, адгарнуў каўнер кашулі, а тады падкасаў рукаў нізкай кашулі, нагарнуў яго на рану і тры столькі і зьверху моцна завязаў насавіком.

— Хоць пакуль што, каб суняць кроў.

За вагонам вецер і дождж. Зрэдку даходзяць далёкія галасы людзей. Часам зусім блізка гукне манэўровы паравоз. Ігнат уздрыгвае.

— Тут сядзі сьмела, — кажа да яго Кудзіш, адгадваючы ягоны настрой. — Я п

Да пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб перабудове органаў кіраўніцтва чыгуначнага транспарту

У пастанове СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб перабудове органаў кіраўніцтва чыгуначнага транспарту, зьмешчанай у «Зьвязьдзе» за 10 ліпеня № 150, з прычыны кепскай перадачы па тэлеграфу, украліся наступныя памылкі:

У другой калёнцы апошні абзац перад 3 разьдзелам, у другім радку замест лічбы 25.18С патрэбна 25.132; у другім радку 3-й калёнкі замест 1736 патрэбна 17.306; у гэтай-жа калёнцы ў пункце «б» 4-га разьдзелу замест: «памочнікаў начальнікаў бюро, патрэбна :«памочнікаў начальнікаў дэпо»; у канцы 5-га разьдзелу прапушчан падразьдзел «ж», які чытаецца так: «ж) кантора пры начальніку вучастку»; у 6-м разьдзеле п. «е» трэба чытаць так: «е) упаўнаважаных па техніцы».

У сувязі з тым, што ў IX разьдзеле ёсьць пропуск, падаем гэты разьдзел поўнасьцю.

IX. АБ НАЧАЛЬНІКУ ДЭПО, ВАГОННАГА ВУЧАСТКУ, СТАНЦЫІ, ДЫСТАНЦЫІ

1. Начальнік дэпо, вагоннага вучастку, станцыі, дыстанцыі зьяўляецца аднаасобным паўнапраўным кіраўніком работ, непасрэдна адказвае за выкананьне пляну па ўсіх паказальніках і ажыцьцяўляе апэратыўнае кіраўніцтва ўсімі работамі па дэпо, вагонным вучастку, па станцыях, у дыстанцыях і нагляде за спраўнасьцю тэхнічных абсталяваньняў дэпо, станцыі, дыстанцыі і іх правільным выкарыстаньнем.

2. Начальніку дэпо вагоннага вучастку, станцыі, дыстанцыі падпарадкоўваецца — адпаведна — ўсе, як пастаянныя, так і часовы агенты і рабочыя.

3. Начальнік дэпо вагоннага вучастку, станцыі, дыстанцыі робіць прыём і звальненьне ўсіх работнікаў за выключэньнем наступных: па дэпо — намесьніка начальніка дэпо, начальнікаў эваротных дэпо і майстраў дэпо, па вагонным вучастку: намесьніка начальніка, вагонных майстраў; па станцыі — намесьнікаў начальніка станцыі, станцыйных дыспэтчараў, дзяжурных на станцыі і загадчыка таварнай кантораў; па дыстанцыі шляху — старшых дарожных майстраў і маставога майстра; па дыстанцыі сувязі — памочніка начальніка станцыі (інжынэр СЦБ), рэвізора-інструктара і інжынэра сувязі. Пералічаных вышэй работнікаў прызначаюць і зьмяшчаюць начальнікі служб дарогі па прадстаўленьні начальнікаў дэпо, станцыі і дыстанцыі.

4. Начальнік дэпо, вагоннага вучастку, станцыі, дыстанцыі ўстанаўляе нормы і расцэнкі на работы, устанаўляе прэміі агентам і рабочым дэпо, станцыі, дыстанцыі ў межах фондаў і згодна ўказаньняў начальніка дарогі.

5. Начальнік дэпо, вагоннага вучастку, станцыі, дыстанцыі абавязан весьці барацьбу з прагульшчыкамі, лятунамі, рвачамі і іншымі дэзарганізатарамі чыгуначнай гаспадаркі і эвальюваць іх у адпаведнасьці з правіламі ўнутранага распарадку.

6. Начальнік дэпо, вагоннага вучастку, станцыі, дыстанцыі забясьпечвае бясьпечнасьць руху ў межах сваіх вучасткаў работы і нясе за яе поўную адказнасьць.

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) абавязваюць НКПШЗ:

1. Правесьці паказаныя вышэй мерапрыемствы па перабудове органаў кіраўніцтва — дэпо, станцыі, дыстанцыі, раёнаў, дарог і НКПШЗ да 1-га жніўня г. г.

2. Правесьці да таго-ж тэрміну (1-га жніўня) перамяшчэньне значнай часткі інжынэрна-тэхнічных работнікаў і гаспадарнікаў з апаратаў раёнаў, дарог і НКПШЗ на лінію для ўмацаваньня пізавых вытворчых зьвяньняў — дэпо, станцыі, дыстанцыі. Перамяшчэньне інжынэрна-тэхнічных работнікаў праводзіць не ў парадку агульнай кампаніі, а шляхам дакладнага пэрсанальнага адбору кваліфікаваных работнікаў, забясьпечэньнем іх нармальнымі жылёва-бытавымі ўмовамі на месцы.

3. НКПШЗ і ЦУНХУ ў 3-хмесячны тэрмін перагледзець усе формы справаздачнасьці, рапучча іх скарачэньню і пакінуўшы толькі абсалютна неабходную для работы дарог статыстычную і апэратыўную справаздачнасьць.

4. Ускласьці на Наркома Камісара Шляхоў Зноскі і Паліткіраўніцтва НКПШЗ, а на дарогах — на начальнікаў дарог і палітаддзелаў — адказнасьць за своячасовае і дакладнае правядзеньне ў жыцьцё даных пастановы.

М. Клімковіч

(старшыня Дзяржынскай райкамісіі па чыстцы КП(б)Б)

ДЗЯРЖЫНСКАЯ РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ НА ЧЫСТЦЫ

Падрыхтоўчая работа да чысткі была праведзена неадвальніяча: ячэйкі, дый то толькі гарадзкія, МТС і саўгасаў, дзе ёсьць палітаддзелы, прапрацавалі пастанову ЦК і ЦКК і ін. спрукацыю па чыстцы. Прапрацоўка ў большасьці вышадкаў прахадзіла толькі сярод членаў і кандыдатаў партыі, яна было праведзена масавай растлумачальнай работы сярод беспартыйных рабочых і калгасьнікаў. У вясковых ячэйках панавала тэорыя чарговасьці — «вось адсеемся, тады разгорнем работу па чыстцы».

Ячэйка на станцыі Койданава пры абгаварэньні пастановы ЦК і ЦКК абмежавалася рэзалюцыяй «прыняць да ведама, зьбіраць кампрамэтуючыя камуністаў матар'ялы». На паўторным сходзе, скліканым пасьля ўказаньня раённай камісіі па чыстцы, выявілася, што камуністы сапраўды «прыберагалі» рад матар'ялаў на асобных членаў партыі спэцыяльна для чысткі.

Зрух у падрыхтоўцы да чысткі пачаў адчуваць толькі пасьля прыезду праверкому, пасьля раённай нарады партактыву. Газэты «Ударнік Дзяржыншчыны» і «Штурмавец Дзяржыншчыны» пачалі больш сыстэматычна (хоць пакуль што ня глыбока) даваць матар'ялы аб чыстцы.

Якія-ж папярэднія вынікі трэба зрабіць на падставе чысткі дзьвюх ячэек (лесазаводу і крэйдавага заводу) і папярэдняй праверкі раду іншых ячэек?

Па-першае, надавычай нізкі палітычны ўзровень членаў партыі заводзкіх ячэек. Галоўная віна ў гэтым клавецца на культпроп райкому: ён аб салютна бязьдзейнічаў у справе арганізацыі вучобы. На гэтых заводах адбылося толькі ў апошні час па тры заняткі. Таму член партыі **Цьвірко** ня ведае, хто такі так. Сталін, кажа, што абскардзіць пастанову ячэйкі можна ў ЦКК, ня ведае, нават у агульных рысах, апошніх пастаноў партыі. Таму ж асобныя члены партыі і не зьяўляюцца ўдарнікамі на вытворчасьці, больш таго, у многіх з іх пануюць адсталыя настроі. Некаторыя партыйцы—**Сіманюк, Цофін, Краўцоў падтрымівалі выступленьні адсталых беспартыйных рабочых аб неабходнасьці перагледзець і зьнізіць нормы, а значыць і прамфін плян.**

Пасобныя члены партыі настолькі аказаліся ў палоне гэтых настрояў, што камісія па чыстцы вымушана была выключыць іх з радоў партыі. Напрыклад, **Цофін** арабіў некаторы прагулаў, самавольна кідаў работу і дырэктару прыхсіпіраў сарамоць і «угаварваць» каб ён вярнуўся на работу. Цофін праяўляў антыпрамадзкія адносіны да заводзкіх ковій: дапускаў вялікую перагрузку, біў і аднаму каню выбіў вока. Ударнікам нікоці ня быў і тэму нізкім аўтарытэтам не карыстаецца, аб чым аднагалосна гаварылі і партыйцы, і беспартыйныя. Другі член партыі —**Краўцоў** атрымаў тры месяцы прымусовых работ за грубасьць. Перад судовай ён сарваў загатоўку насеньня для прыгарадняй гаспадаркі. Само сабою зразумела, што такі «камуніст» ня мог мець і ня мае нізкага аўтарытэту, а проста дыскрэдытуе партячэйку.

Гэтыя ячэйкі безумоўна маюць і добрых членаў партыі, якія пасьля вялікай школы грамадзянскай вайны прышлі на завод па-бальшавіцку будаваць сацыялізм. Возьмем, напрыклад, члена партыі ячэйкі лесазаводу тав. **Куцкіна.** Ён перны абвінчае сябе ўдарнікам, выклікае на сацспаборніцтва брыгаду рамшчыкаў, распрацоўвае з імі сацдагавор і, калі раней былі прастоі з-за несвячасовай дастаўкі калод, то зараз няма ні адной хвіліны прастою з гэтай прычыны. Беспартыйныя рабочыя кажуць: яго мы паважаем, ён за якую работу ня возьмецца — выхане акуратна.

Тое-ж можна сказаць і аб сакратару ячэйкі тав. **Ермаку.** Былы чырвона гвардзеец, два разы паранены, ня гледзячы на сваю малапісьменнасьць, ён спрыхладае ўсе намаганьні, каб наладзіць работу на заводзе. Да выключэньня сакратаром ён быў адным з лепшых ударнікаў.

Другое, што заўважаецца пры чыстцы—гэта хаатычнае становішча гаспадарчага жыцьця на асобных прадпрыемствах. «Раённы камбінат»--гэта мэханічна аб'яднаныя заводзікі: крэйдазавод, лесазавод, млын, электрастанцыя. Ні адно з іх не пераведзена на гаспадарчы разрахунак (апрача крэйдазаводу), ня мае свайго дырэктара-адзінаначальніка. Та му й сыстэматычнае невыкананьне прамфінпляну, няправільная расстаноўка рабочай сілы, адсутнасьць адказнасьці як з боку «старшых рабочых» па заводах, так і з боку самых рабочых. Яшчэ і зараз панае абязьлічка. Дырэктар камбінату, ён жа дырэктар лесазаводу, яшчэ не адгадаў зусім нескла даных прымітыўных тэхнікай сваіх прадпрыемстваў, а таму кіруе «пагонул». Ячэйка па яго дакладах прымае агульныя, неканкрэтныя пастановы. Ведаючы усё гэта, раённыя арганізацыі абмяжоўваюцца толькі рэзалюцыямі, а каб прысьці на завод і па-сапраўднаму дапамагчы арганізаваць гаспадарку заводу, навучыць парт'ячэйку, што і як трэба рабіць, — гэтага яшчэ няма. І недарма рабочыя скардзіліся. «Раённых работнікаў у нас ня бывае, едуць міма, бачаць — дым ідзе з коміну, значыць завод працуе, ну і добра, а што на заводзе—яны ня ведаюць».

Адсутнасьць арганізацыі працы ў радзе выпадкаў прыводзіць да паслабленьня дысцыпліны, стварае ўсе ўмовы для адрыву камуністаў-кіраўнікоў ад масы рабочых, спрыяе разлажэньню асобных рабочых і кіраўнікоў.

Трэцяе, што трэба падкрэсьліць, гэта адсутнасьць масавай работы сярод рабочых. Заводзкія камітэты абодвых заводаў бясформенныя, кіселяпадобныя арганізацыі: Шмат гутарак, мітусьні і ніякай практычнай работы. Бібліятэчкі на замку, газэты кідаюцца абы-дзе, чытак і гутарак у абедзенны перапынкі не праводзіцца, а калі і бываюць яны, дык на агульна-саюзныя тэмы, а не аб тым, што хвалюе на сёньня завод. Вечныя скаргі прафсаюзных «правадыроў» — «наш народ не актыўны, на сход яго незацягнеш», а побач з гэтым 100-процантная падпіска на пазыку, дзельныя і трапныя, надавычай канкрэтныя выступленьні беспартыйнага актыву па пытаньнях вытворчасьці ў часе чысткі, добрая работа брыгад у падшэфных калгасах. Гэта сьведчыць пра актыўнасьць і высокая палітычная сьвядомасьць масы рабочых ёсьць, але яе ня ўмеюць арганізаваць.

***

Трэба адзначыць, што зацікаўленасьць і партарганізацыі, і беспартыйных рабочых да чысткі ўсё павышаецца. Сходы вясковых ячэек, дзе 5-6 камуністаў, наведвала 140-160 сялян, а чыгуначнікі прыходзілі на сход амаль на 100 проц. Чыстка ператвараецца ў сапраўды вялікую палітычную школу. Асабліва рэзкую крытыку выклікаў даклад сакратара ячэйкі **прамкаапэрацыі.** Апартуністычныя адносіны да прамфінпляну прывялі да таго, што ён выкананецца на 20-50 проц. Якасьць работы надавычай нізкая, асартымэнт вырабу ня ўвязан з патрэбнасьцямі спажыўца (затаварваньне арцелі «Чырвоны штампаўшчык» на 20 тыс. руб.), абсалютная адсутнасьць масавай і культурнай работы. «Разумныя» праўленцы ўмудрыліся на ўсю зіму зачыніць адзіны ў горадзе клюб пад вовае канцылярыі. Камісія сакратара ячэйкі Раткіна, як апартуніста, з партыі выключыла.

У вясковых ячэйках палітычнае пасьпаўлена была з рук вон дрэнна. Сяброўства была пастаўлена і масава-выхаваўчая работа сярод калгасьнікаў. У калгасе «Расьсьвет», Байдацкага сельсавету, старшыня калгасу Мірончык дапускаў беспакарна надзвычай прубыя адносіны да калгасьнікаў, зацікаў сама крытыку, а ячэйка не рэагавала. Мірончык парушае закон ад 7 жніўня: пасевы не ахоўваюцца і кулацкія элементы беспакарна робяць патравы. Гэтыя-ж элементы спалілі калгасную пабудову, дзе быў інвэнтар. І ня толькі ня прыняты —меры, каб выявіць падпальшчыкаў, але нават вартавыя не прыцягнуты да адказнасьці. Ня дзіва, што гэтакая практыка суправаджаецца «тэорыямі» аб тым, што «беднякі ў калгасе працуюць дрэнна, добра працуюць заможчікі» і г. д.

Камісія Мірончыка, ня гледзячы на яго вялікі партыйны стаж, з партыі выключыла.

Трэба сказаць, што кулацкая работа ў Дзяржынчыне ва многіх мясцох яшчэ ня поўнасьцю выкрыта. У апошні час раённая кантрольная камісія ўскрыла рад спраў зрастаньня часткі вясковых работнікаў з кулацкімі элементамі (навадзорская справа, дзе сельсаветам і калгасамі фактычна кіравалі кулакі). Зараз праводзіцца ўзмоцненая чыстка калгасаў ад кулацкіх элементаў. Чыстка партарганізацыі ўскалыхнула ячэйкі, узмацніўся сацыялістычная дапамога калгасаў, саўгасаў адстаючым. Калгасы, скончыўшы сяўбу, пасылалі дзесяткі парак коняй з уласнымі плугамі, на ўласных харчох, з уласным насеньнем і засялалі палі адстаючым.

У ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ

Германскі фашызм актыўна падрыхтоўваецца да вайны

Францускі друк аб узбраеньнях Германіі

ПАРЫЖ, 9. (БЕЛТА). «ЖУРНАЛЬ» прыводзіць рад фактаў, якія паказваюць на ўзмацненьне ўзбраеньняў і падрыхтоўку вайны ў Германіі. Так, 1) усе студэнты юрыдычных факультэтаў павінны будуць з гэтага часу праходзіць стаж ваеннай падрыхтоўкі ў лягерах, 2) імпэрскі ўрад забараніў раздрабленьне буйных маёнткаў, каб мець магчымасьць разгарнуць ва ўсходніх правінцыях у буйных маштабах вытворчасьць жыта для харчовага снабжэньня Германіі на выпадак вайны, 3) міністар авіяцыі Герынг перадаў авіяцыйнай кампаніі «Люфтганза» на 13 млн. марак заказаў на будаўніцтва самалётаў і зацьвердзіў на 1933 г. субсыдыі авіяцыйным кампаніям у 25 млн. марак. Міністэрства авіяцыі робіць націск на муніцыпалітэты, каб прымусіць іх будаваць аэрапляны на свой кошт. Апрача таго, у распараджэньне германскай ваеннай авіяцыі казначэйствам пераведзены буйныя грашовыя фонды, 4) па ініцыятыве фашысцкіх арганізацый ствараюцца ваянізаваныя атрады маладых піпотаў, 5) тэкстыльная прамысловасьць Германіі працуе з поўнай нагрузкай, у той час як экспарт тэкстылю нязначны, а пакупальная здольнасьць насельніцтва Германіі не дазваляе пашыраць унутраны рынак збыту. (Газэта сьцьвярджае, што тэкстыльныя заводы выпрацоўваюць галоўным чынам сукно ваеннага ўзору), 6) фірма «Бэрлін-Карльсруэ» аднавіла сваю даваенную назву «Германсхія фабрыкі ваеннага аснашчэньня» і ў сваёй справаздачы адзначае «сур'ёзны паварот у справах», наступіўшы пасьля прыходу да ўлады Гітлера.

«ЖУРНАЛЬ ДЭ ДЭБА» прыводзіць цыркуляр міністэрства прапаганды, у якім прапануецца друку ўнікаць апублікаваньня інфармацый, якія датычаць узамаадносін паміж ваеннымі ўстановамі і арганізацыямі, кіруючымі грамадзкімі работамі, пытаньняў ваеннага спорту, навучаньня насельніцтва вэдованьню зброяю, перасоўваньне войск рэйхсвэру і паліцэйскіх часьцей.

У пошуках камуністычнай літаратуры

Масавыя вобыскі і арышты па ўсёй Германіі

БЭРЛІН, 9 (БЕЛТА). За нелегальную рэвалюцыйную дзейнасьць у ГАМБУРГУ арыштаваны трое рабочых. Знойдзена нібыта вялікая колькасьць камуністычнай літаратуры. У ШВЭРЫНЕ за нелегальную камуністычную дзейнасьць арыштаваны і адпраўлены ў канцлягер 30 рабочых. У РЭКЛІНГАЎЗЭНЕ (Рурская вобласьць) 8 камсамольцаў арыштаваны за пашырэньне забароненай камсамольскай газэты «ЮНГЕ ГАРДЭ». У АЛЬТОНЕ нібыта раскрыта камуністычная арганізацыя, выяўлена вялікая колькасьць нелегальнай літаратуры. Арыштавана 70 чалавек. У БЭРЛІНЕ нібыта выяўлены нелегальныя камуністычныя друкарні. Паліцыя папярэджае, што ўсякі, у каго будуць выяўлены камуністычныя лістоўкі, будзе арыштаваны.

***

ПАРЫЖ, 10 (ТАСС). Агенцтва «ІМПРЭС» паведамляе з Германіі: «Начальнік дармштадзкай паліцыі абвясьціў, што ЎСЯКІ, У КАГО ЗНОЙДУЦЬ НЕЛЕГАЛЬНУЮ ЛІСТОЎКУ, БУДЗЕ НЕАДКЛАДНА АРЫШТОВАН І ШТО ПАЛІЦЭЙСКІЯ АГЕНТЫ АТРЫМАЛІ ЗАГАД РАССТРЭЛЬВАЦЬ УСІХ ПАШЫРАЮЧЫХ ГЭТЫЯ ЛІСТОЎКІ.

Улады вельмі занепакоены пасьпяховым распаўсюджваньнем нелегальнай літаратуры. Ні паліцыя, ні штурмавікі ня могуць выявіць вінаватых. АНТЫГІТЛЕРАЎСКІЯ ЛІСТОЎКІ ПАШЫРАЮЦЦА ВА ЎСІХ МЯСЦОВАСЬЦЯХ ГЕРМАНІІ».

Новая антысавецкая кампанія германскіх фашыстаў

БЭРЛІН 10 (Белта). Германскі друк, які знаходзіцца пад кантролем нацыянал-сацыялістаў, праводзіць за апошні час у арганізаваным парадку сыстэмаціцную рэзкую кампанію хлусьні і паклёпу супроць СССР з прычыны нібыта «дапамогі немцам у СССР». У гэтай кампаніі пад кіраўніцтвам нацыянал-сацыялісцкай партыі прымаюць актыўны ўдзел «САЮЗ ЗАМЕЖНЫХ НЕМЦАЎ» І ЦАРКОЎНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ. Друк зьмяшчае адозву гэтых арганізацый і артыкулы, у якіх паведамляюцца паклёпніцкія выдумкі аб «голадзе» і «жахах», нібыта перажываемых немцамі ў СССР.

У мэтах прыданьня гэтым выдумкам хоць бы відочнасьці праўдападобнасьці, «САЮЗ ЗАМЕЖНЫХ НЕМЦАЎ—, АРГАНІЗАВАЎ У БЭРЛІНЕ СПЭЦЫЯЛЬНУЮ ВЫСТАЎКУ ЯЎНА ФАЛЬШЫВЫХ ЛІСТОЎ І ЎСЯКАГА РОДУ ІНШЫХ ФАЛЬШЫВАК, якія павінны «даказаць» мнімыя «жахі», нібы перажываемыя немцамі ў СССР. Вышэйшы савет евангелічнай царквы рэкамандаваў усім пастарам у часе царкоўных набажэнстваў выступаць з цкаваньнем СССР і заклікаць да ахвяраваньняў на карысьць нібыта «галадаючых у СССР немцаў».

7-га ліпеня ў МЮНХЭНЕ адбылася антысавецкая дэманстрацыя супроць мнімага «прасьледваньня немцаў» у СССР. На мітынгу выступілі прадстаўнікі «Саюзу замежных немцаў» і нацыянал-сацыялісцкай партыі. Учора ў БЭРЛІНЕ адбыўся скарбочны збор на карысьць «галадаючых» у СССР немцаў. Усегерманскі камітэт дапамогі «галадаючым» зьвярнуўся з заклікам уносіць ахвяраваньні не натурай, а грашыма, на якія, паводле споў камітэту, нібыта будуць зроблены неабходныя за купкі, якія ў асобных пакетах будуць дастаўлены «галадаючым немцам».

Як паведамляе агенцтва «Вольф», прэзыдэнт ГІНДЭНБУРГ і рэйхсканцлер ГІТЛЕР унесьлі свае ахвяраваньні ў фонд «Дапамогі» мнімым «галадаючым» у СССР немцам.

Заключэньне згоды паміж Ватыканам і Германіяй

БЭРЛІН, 9 (БЕЛТА). Афіцыяльна паведамляюць, што ўчора ў Рыме германскім віцэ-канцлерам фон-Папэнам і кардыналам Пачэлі парафіравана канкардат (згода, якая рэгулюе адносіны паміж царквою і ўрадам) паміж Ватыканам і германскім урадам. На аснове гэтай згоды сёньня Гітлер адмяніў забарону тых каталіцкіх царкоўных і культурных арганізацый, якія прыманы парафіраваным учора канкардатам. Акрамя гэтага, адмяняюцца ўсе адміністрацыйныя меры, якія прадпрыняты супроць каталіцкага духавенства і інш. кіраўнікоў, прызнаных канкардатам каталіцкіх арганізацый. Падпісаньнем канкардату паміж Ватыканам і германскім урадам у дастатковай меры забясьпечваецца бязагаворачны пераход каталікоў на службу гітлераўскам новай нацыянал-сацыялісцкай дзяржавы.

***

ПАРЫЖ, 9 (БЕЛТА). Рымскі спэцыяльны карэспандэнт «ТАН» паведамляе, што **Мусаліні** выступіў пасродкам у перагаворах Германіі з Ватыканам аб заключэньні канкардату, узамен якога Германія згадзілася нібыта зьмяніць сваю пазыцыю ў дачыненьні Аўстрыі і падпісаць «пакт 4-х».

Англія незадаволена валютнай палітыкай ПАЗШ

ЛЁНДАН, 9 (ТАСС). Актыўнае спаборніцтва ПАЗШ па зьніжэньні курсу валюты (доляр упаў амаль што на 30 проц. супроць нарытэту), а таксама новае адмаўленьне Рузвэльта абмяркоўваць пытаньне аб стабілізацыі валют выклікае рэзкае, дрэнна скрытае незадавальненьне ў ангельскіх колах. Асабліва адкрыта выказваюцца ў нядзельных газэтах аўтары, якія не зьяўляюцца звычайнымі выказчыкамі афіцыяльных колаў. Так, напрыклад, **Сноўдэн** мімаходам падкрэсьлівае, што ціперашні «бум» ў ПАЗШ інсцэніраваны і пазбаўлены эканамічнай базы. Графіня **Асквіт** у «Сэндэй дыспэч» скардзіцца на тое, што Рузвэльт «скалечыў канфэрэнцыю». «**Сэндэй Таймс**» піша, што Рузвэльт «узарваў канфэрэнцыю».

Канцлягеры для беспрацоўных

ВАРШАВА, 9. (УЛАСН. ІНФАРМ. «ЗЬВЯЗДЫ»). Бязупынны рост беспрацоўя прымушае польскую буржуазію шукаць новых сродкаў барацьбы з ім. Гэтым новым сродкам зьяўляюцца так званыя «лягеры працы» для беспрацоўных. Як піша «РОБОТНІК», такі лягер ужо заснован на ваенную нагу і кіруюць ім афіцэры і падафіцэры польскага войска. «Рабочыя, якія знаходзяцца ў гэтым лягеры,—піша «Роботнік», — жывуць у казармах і падлягаюць ваённаму рэжыму. 8 гадзін яны працуюць на пабудове ваеннага стадыёну, а рэшту дня праходзяць ваенныя практыкаваньні пад кіраўніцтвам вайсковых інструктароў. За гэта рабочыя атрымліваюць патрачэнную вайсковую вопратку, ежу і 15 злотых грашыма ў месяц».

Гэтым спосабам польская буржуазія хоча ізаляваць беспрацоўных ад рэвалюцыйнага руху і выхаваць з іх «пакорлівых авечак» капіталізму.

Расьсьледваньні дзеяньняў пагранпаста мысу Ольга

ПЕТРАПАЎЛАЎСК на КАМЧАТЦЫ, 9. (Белта). Выяўлены асабісты склад паста пагранпаховы, які абвінавачваецца ў сувязі з інцыдэнтам каля мысу Ольгі, арыштаваны і адпраўлены ў ПЕТРАПАЎЛАЎСК. Аб дзеяньнях паста і начальніка паста вядзецца сьледзтва. Арыштаваны таксама начальнік патранпаховы Камчаткі **Кісялёў.**

Кандыдаты на прэміяваньне па ўсебеларускім спаборніцтве за лепшае правядзеньне веснавой сяўбы

Ніжэй друкуецца сьпіс кандыдатаў— перадавых ударнікаў: рабочых саўгасаў, брыгадзіраў калгасаў, калгасьнікаў і лепшых перадавых працоўных аднаасобнікаў.

Працяг гл. у № 150.

127. Барушка — старшы аграном Смалявіцкай МТС.

128. Захаропка Пётр Лявонаў — старшы аграном Рагачоўскай МТС.

129. Галубоў Іван Пётраў — вучастковы аграном Церахоўскай МТС.

130. Малаеў Зьмітра — загадчык вытворчага вучастку Церахоўскай МТС.

131. Жукоўскі — старшы аграном Танежскай МТС.

132. Бліэьнок — загадчык вытворчага вучастку Танежскай МТС.

133. Шляга А. — загадчык вытворчага вучастку Жыткавіцкай МТС.

134. Богуш П. І.— старшы аграном Старобінскай МТС.

Камісія ЦК КП(б)Б па сацыялістычным спаборніцтве з Заходняй вобласьцю просіць усе арганізацыі, а таксама калгасьнікаў, рабочых саўгасаў, працоўных аднаасобнікаў, спэцыялістаў, маючых тыя ці іншыя заўвагі альбо прапановы па вылучаных кандыдатурах даслаць тэрмінова і неадкладна камісіі.

Адрас камісіі: Менск, ЦК КП(б)Б, камісія па спаборніцтве.

Школе—наша агульная дапамога!

Да ўсіх рабочых, ІТР, калгасьнікаў-ударнікаў 2-га Усебеларускага зьезду калгасьнікаў

З адозвы рабочых-ударнікаў, ІТР і служачых чырвонасьцяжнага машына-будаўнічага заводу імя Варашылава

Вітаем правядзеньне ўсесаюзнага агляду па падрыхтоўцы да новага навучальнага году, абвешчанага УсеЦСПС, Наркамасьветы РСФСР, Украіны і газэтай «ЗКП». Вітаем уключэньне ў агляд НКА Беларусі і па прыкладу нашых лепшых гігантаў (Урапмашбуд, «Шарыкападшыпнік», імя Кагановіча) уключаемся ў гэты агляд.

Змагаючыся за канчатковую перамогу сацыялізму, мы ні на адну мінуту не павінны забываць аб нашым падрастаючым пакаленьні, аб нашых дзецях, аб іх вучобе і камуністычным выхаваньні. Работа школы, якая павінна, як паказана ў праграме партыі: «выхаваць пакаленьне здольнае канчаткова ўстанавіць камунізм», павінна быць прадметам нашай асаблівай увагі і пастаяннай дапамогі ўсіх нас і кожнага ўдарніка.

Мы дапамагалі сваім падшэфным школам 20, 8 і 40 змагацца за рэалізацыю пастаноў ЦК аб школе. Нашы падшэфныя школы дабіліся значных посьпехаў у барацьбе з карэннымі недахопамі, за сыстэматычныя воды, за сьвядомую дысцыпліну, за камуністычнае выхаваньне дзяцей. Процант другагодніцтва ў нашых падшэфных школах зьнізіўся да 8 ПРОЦ. Пры нашай дапамозе ўдалося стварыць мэханізаваныя майстэрні ў 20-й школе.

Але нельга супакойвацца на гэтым. Перад намі стаіць адказнейшая задача — ДАПАМАГЧЫ ШКОЛАМ ПОЎНАСЬЦЮ І СВАЯЧАСОВА ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ.

Мы ўключаемся ў агляд падрыхтоўкі да новага навучальнага году і будзем змагацца за тое, каб ударна падрыхтаваць нашы падшэфныя школы, ПЕРАТВАРЫЎШЫ ІХ НА ПРАЦЯГУ 1933-34 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ Ў ПЕРАДАВЫЯ ШКОЛЫ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

Мы бярэм на сябе наступныя абавязкі:

1. У кожным цэху вылучыць брыгады з лепшых ударнікаў для дапамогі падшэфным школам у падрыхтоўцы да новага навучальнага году. Устанавіць пастаянны кантроль за ходам іх работы. Заслухоўваць у брыгадах даклады вылучаных па шэфству над школай.

2. Для арганізацыі лягераў, аздараўленчых мерапрыемстваў і дапамогі школам адпусьціць 3.600 руб. Устанавіць наведваньне лепшымі ўдарнікамі лягераў падшэфных школ. Забясьпечыць дапамогу ў арганізацыі аздаравіцельнай, выхаваўчай работы ў лягерах.

3. Дапамагчы школам у арганізацыі рабочых пакояў.

4. Дапамагчы 8-й школе мэханізаваць майстэрню.

5. Устанавіць сыстэматычную дапамогу ІТР у практычным ажыцьцяўленьні політэхнізацыі школы.

6. Абвясьціць заклік лепшых ударнікаў на дапамогу педагагічным калектывам у падрыхтоўцы да новага навучальнага году.

7. Устанавіць пастаянны падлік дзяцей усіх новапрыбываючых на завод рабочых, забясьпечыўшы стопроцантны ахоп іх школай у новым навучальным годзе.

8. Праверыць сіламі грамадзкасьці выкананьне ўзятых дагаворных абавязацельстваў перад школамі, дабіўшыся поўнага выкананьня пунктаў.

9. Да пачатку навучальнага году замацаваць за школай піянэрважатых з лепшых стойкіх і вытрыманых камсамольцаў.

10. Падабраць і вылучыць з лепшых ударнікаў прадстаўнікоў ва ўсе школьныя арганізацыі, абавязаўшы іх своячасова ўключыцца ў работу апошніх.

11. На стэнках заводзкай шматтыражкі сыстэматычна асьвятляць ход падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Выклікаем на сацспаборніцтва ЗАВОД «КАМУНАР», «БАЛЬШАВІК» (МЕНСК), ГОМСЕЛЬМАШ, ЗАВОД ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА (ГОМЕЛЬ), «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» (ВІЦЕБСК).

Мы зварачаемся да вас, ударнікі-калгасьнікі сацыялістычных палёў, удзельнікі II усебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў: УКЛЮЧЭЦЕСЯ Ў АГЛЯД ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ НАШЫХ ШКОЛ. Сваім актыўным удзелам і дапамогай забясьпечце поўную гатоўнасьць школ да заняткаў.

ПОДПІСЫ: сакратара парткалектыву, старшыні заўкому, дырэктара заводу і 48 рабочых-ударнікаў.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 13, 14 і 15 ліпеня г. г. у Полацку будзе працаваць ПТ ЦКК КП(б)Б па разгляду партспраў Полацкага, Вушацкага і Расонскага раёнаў.

Выклікаюцца наступныя таварышы:

На 13-VII-33 г.

Грыз Хвёдар, Стаховіч Мікола Ул., Дзейч Я., Сьвідзінскі Ул. А., Правада С., Пакроўскі П. П., Гуськоў Я. С., Красінскі Н. П., Растуноў Н. М., Шары Ф. Ф.—Вушацкі раён; Малахоўскі А., Ісакаў Г. А., Эпштэйн К. Я., Радзюк Ф. Я., Касарэўскі Г. А., Казлоў Я. С., Баранаў Я. Д., Луфэраў З. С.—Расонскі раён.

На 14-VII-33 г.

Блаў Р. М., Макарэнка П. В., Іваноў К. Ц., Атрошчанка П. П., Ісідараў Я. В., Арцем'еў П. Я., Кубам І. А., Зайцаў А. Ф., Літвінаў М. Ф., Мятлюк А. Я., Данчанка М. Ф., Гвазьдзоцкі В. І., Таранкоў Я. М., Дабравольскі М. І., Вепікаў П. А., Заемка А. І., Лазоўскі Я. Ф., Верабейчык Я. А., Кавалёў А. Зьм. Буланаў І. П., Макараў Г. А., Мажэйка В. Я., Абрамзон К., Шыраеў П. К., Рубін А. Ф., Заблоцкі В. В., Зарэцкі (Тураўлянскі сельсавет), Мінчукоў А. Н.—Полацкі раён.

Яўка памянёных таварышоў абавязкова.

Праезд не аплачваецца.

Да дня разгляду справы выклікасмым таварышом неабходна прадставіць ПТ характарыстыкі ячэек.

Член ПК ЦКК КП(б)Б ЖМЫРКО.

***

ПК ЦК КП(б)Б паведамляе, што 13, 14 і 15 ліпеня г. г. у Бабруйску будзе працаваць партпройка ЦКК КП(б)Б па разгляду партспраў Бабруйскага, Глускага і Парыцкага раёнаў.

Выклікаюцца наступныя таварышы:

На 13-VII-33 г.

Лапкоўскі А. С., Левін С. С., Барысік Сьцяпан Н., Барысік Максім А., Пархоменка Герасім Паўлаў — Глускі раён; Лобаз П. П., Дворкін А., Мітра фанаў С., Дзячэнка К. М. — Парыцкі раён.

На 14-15-VII-33 г.

Эль Абрам Якаўлаў, Габрусь Васіль Захараў, Шмаргун Мікола Язэпаў, Ражэўскі Навум Саламонавіч, Шчадрынскі А. М., Тынкоў Б. М., Лузанаў А. В., Ледарман Э. М., Шмідт Г. О., Нямпомнішчы, Кацнэльсон Ізраіль, Спадковіч Н. Н., Гучко П. С., Апранін П. К., Сбатко Я. С., Ашаровіч С., Розэнбаум С. М., Вячэра С. П., Наскевіч В. І., Клейнэр Ю. М., Ніськовіч Г. М., Цэханоўскі Г. С., Кацнэльсон Н. З., Гнядзенка А. Н., Зубар Л. Л., Бэрштэйн Ф. Ю., Панізовіч Е. П., Жураўлёва Б. Я., Кантаровіч С., Гелер І. В., Лявонаў А. І., Давідоўскі І., Мельнікаў С. А., Еўлаш М. Ц., Белякоў Н. С., Крукаў Ф. І., Паўлаў А. М., Кучынскі Рыг. М., Мазурык, Гайсенка.

Яўка памянёных таварышоў абавязкова.

Да дня разгляду справы таварышом неабходна прадставіць ПТ характарыстыкі ячэек аб сваёй апошняй рабоце.

Член ПК ЦКК КП(б)Б СЬЦЯПНЯК.

***

12 ліпеня а 12 гадзіне дня на пляцы Парыскай камуны адбудзецца